

НОВАЯ ЗОРКА БАТУТНАГА СПОРТУ **10**

ГЛЕБ ОТЧЫК ПРА БУДУЧЫНЮ САЮЗА МАСТАКОЎ **13**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 СТУДЗЕНЯ 2020 г. СУБОТА № 11 (29125)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК, кансультант упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі:

«Гаворачы аб развіцці шостага школьнага дня, мы пастаянна робім акцэнт на неабходнасці прыцягнення бацькоў да яго арганізацыі. Дзіцяці, напэўна, будзе цікавей, яно будзе ганарыцца тым, што разам з ім у мерапрыемствах удзельнічаюць мама і тата. Любы з бацькоў зацікаўлены ў развіцці свайго дзіцяці. І калі дзіця ў вольны час не боўтаецца без справы, не сядзіць у гаджэтах, а ўдзельнічае ў нейкіх аб'яднаннях па інтарэсах, мерапрыемствах, якія праводзяцца ў шосты школьны дзень, бацькі будуць гэта вітаць».

КАРАТКА

- **У Беларусі ствараюць фонд універсальнага абслугоўвання сувязі і інфарматызацыі.**
- У нашай краіне 37,5 % работнікаў атрымліваюць зарплату вышэй за Br1 тыс.
- **У Палацы грамадзянскіх абрадаў Мінгарвыканкама 2020/02/02 распішуць каля 20 пар.**
- Новым генеральным сакратаром НАК Беларусі прызначаная Паліна Галавіна.
- **Хакеісты з краін ЕАЭС перастануць лічыцца легіянерамі ў расійскіх клубах.**
- Экіпаж «МАЗ-СПОРТ-аўта» Сяргея Вязовіча заняў трэцяе месца на «Дакары-2020».
- **У Мінску фура заехала ў будынак хлебакамбіната. Кіроўца выйшаў для афармлення дакументаў, а грузавік пакінуў з працуючым рухавіком.**

ISSN 1990 - 763X

Пляцоўка для кемлівых

Фота БелТА.

Лабараторыю інжынерна-тэхнічнай творчасці старэйшых школьнікаў і студэнтаў STEM-Hub адкрылі ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны. Новы цэнтр прыцягнення для кемлівых маладых людзей з тэхнічным складам розуму размясціўся на факультэце фізікі і інфармацыйных тэхналогій універсітэта. Несумненна, зацікаўленыя студэнты, такія як Юрый МАКАРАНКА *(на фота)*, будуць у лабараторыі частымі наведвальнікамі.

Школа для бацькоў

СМАЙЛІК... У ПАДТРЫМКУ

Ці можна выхоўваць дзіця ў сацыяльных сетках?

Анлайн-жыццё падлеткаў усё часцей становіцца прычынай сямейных канфліктаў. «Лабараторыя Касперскага» правяла адпаведнае даследаванне і ўстанавіла, што такія праблемы актуальныя для кожнай трэцяй сям'і, дзе выхоўваюцца дзеці ва ўзросце ад 11 да 14 гадоў. Практычна чвэрць апытаных бацькоў штосьці насцярожвала на старонках іх сыноў і дачок у сацыяльных сетках. У 14 працэнтах выпадкаў канфлікт узнікаў з-за таго, з кім кантактуе там дзіця (асабліва гэта актуальна для сем'яў, у якіх выхоўваецца дзяўчынка). Амаль 40 працэнтаў апытаных канстатавалі, што хацелі б кантраляваць, дзе знаходзяцца іх непаўналетнія дзеці, з дапамогай геалакацыі, але пры гэтым не ведаюць, як гэта зрабіць.

Факт знаходжання ў сябрах у свайго дзіцяці ў сацыяльных сетках для многіх дарослых з'яўляецца доказам таго, што яны добрыя бацькі, — маўляў, дзіця нам давярае. Але не сакрэт, што некаторыя аказаным даверам злоўжываюць і спрабуюць арганізаваць сачэнне ў сацыяльных сетках, бо так хочацца пераканацца, што з тваёй крывіначкай усё ў парадку, і панізіць градус бацькоўскіх турбот...

СТАР. 4

Меры бяспекі

Каб на Вадохрышча не патануць і не прастудзіцца...

Сёлетняя зіма не радуе нас марозным надвор'ем. Не маюць аптымістычных прагнозаў сіноптыкі і на 19 студзеня, калі праваслаўныя адзначаюць Вадохрышча — час, які паводле народных назіранняў павінен быць самы халодны зімой. Пакуль на вадаёмах краіны няма лёду, а ўдзень тэмпература паветра стабільна з «плюсам». Але гэта не нагода адмаўляцца ад звычаю акунуцца ў купель 19 студзеня. У сталіцы і рэгіёнах сёлета для гэтага падрыхтавана 87 месцаў — побач з 52 выратавальнымі станцыямі і 35 пастамі. У сталіцы два з іх, напрыклад, абсталяваны ўсім неабходным: палаткамі з ацяпленнем і гандлёвымі пунктамі, дзе можна набыць гарбату, іншыя гарачыя напоі і ежу. Пры гэтым выратавальнікі апасаюцца, што з-за адсутнасці лёду людзі будуць акунацца там, дзе ім бліжэй і зручней, а не ў спецыяльна абсталяваных месцах. З гэтай нагоды прыняты адпаведныя меры бяспекі.

Падрыхтавана 87 месцаў для акунання

— Усе маторныя лодкі і катары з улікам таго, што ёсць магчымасць іх праходу па вадзе, прыведзены ў стан поўнай гатоўнасці, каб мы маглі быць побач падчас стыхійных купанняў і пры неабходнасці аказаць дапамогу. Усе падраздзяленні Беларускага рэспубліканскага таварыства выратавання на водах (АСВОД) пераведзены на ўзмоцнены варыянт нясення службы. З 18 да 20 студзеня бяспеку будзе забяспечваць 400 штатных работнікаў АСВОД, — паведаміў **старшыня рэспубліканскага таварыства выратавання на водах Анвар ІГАМБЕРДЫЕЎ.**

СТАР. 5

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Высокія вынікі выклікаюць пачуццё шчырага гонару за наш народ»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў ордэны і прысвоіў ганаровыя званні

Учарашняя сустрэча ў Палацы Незалежнасці яшчэ раз нагадала пра тое, што плённая праца, узорнае выкананне сваіх абавязкаў, прафесіяналізм ніколі не застануцца без увагі. Не важна, у якой сферы і на якой пасадзе. Навуковы супрацоўнік і генеральны дырэктар буйнога прадпрыемства, спартсмен-навучэнец і галоўны трэнер нацыянальнай каманды, следчы па асабліва важных справах і генерал-маёр, першы намеснік міністра і кіроўца — узнагароды заўсёды знаходзяць сваіх герояў. Пра такіх людзей кажуць, што яны працаголікі, фанатыкі сваёй справы. Але менавіта гэтыя дзеячы натхняюць на здзяйсненні іншых і на ўласным вопыце даказваюць — немагчымага не бывае.

Фота БелТА.

Для ўзнагароджаных у Палацы Незалежнасці правялі экскурсію.

«Праца кожнага з вас важна для дзяржавы, вашы сумленнасць і адданасць справе захапляюць, а высокія вынікі выклікаюць пачуццё шчырага гонару за наш народ. Тут сабраліся прадстаўнікі практычна ўсіх найважнейшых сфер жыцця. І прыклад вашых заслуг павінен стаць арыенцірам на будучы ўвесь дваццаты працоўны год», — сказаў Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўзнагароджання.

Па яго словах, мы ўшаноўваем працавітых, таленавітых і мэтанакіраваных людзей, чый трыумф падзеліць уся краіна.

Кіраўнік дзяржавы выказаў удзячнасць прадстаўнікам вытворчай сферы, дзякуючы якім прадукцыя пад маркай «Зроблена ў Беларусі» высока цэніцца ў розных кутках планеты: ***«Давер людзей якасці нашых тавараў дарагога каштуе, але патрабуе пастаяннай самаадданасці і ўпартасці ў працы».***

Падзякаваў Аляксандр Лукашэнка за працу вучоным, якія ствараюць тэхналагічную аснову развіцця Беларусі.

Высокіх узнагарод і званняў удастоены дзеячы культуры і мастацтва. «Творчыя праекты многіх айчынных музыкантаў, вакалістаў, мастакоў і кінематаграфістаў (часам) з'яўляюцца «залатым фондам», нацыянальным здабыткам Беларусі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Шэрагі заслужаных майстроў спорту папоўнілі атлеты, якія праслаўляюць краіну сваімі перамогамі, і, як сказаў кіраўнік дзяржавы, аб'ядноўваюць усіх нас у самым шчырым пачуцці — пачуцці нацыянальнага гонару.

Адзначыў Аляксандр Лукашэнка працу педагогаў. На іх плячах — адказнасць за будучыню нашай краіны і ўмацаванне самасвядомасці беларусаў.

«У год 75-годдзя Вялікай Перамогі ***неабходна ўдзяліць асаблівую ўвагу пытанням захавання гістарычнай памяці і традыцыйных маральных каштоўнасцяў,*** выхаванне падрастаючага пакалення на прыкладах гераічнага подзвігу нашага народа», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Асаблівыя словы ўдзячнасці, канешне, былі адрасаваны вайскоўцам, супрацоўнікам праваахоўных органаў і судовай сістэмы. Любыя мэты дасягальныя, калі ў грамадстве пануюць мір, стабільнасць і парадак.

«Увасабляючы ў жыццё свае самыя амбіцыйныя планы, вы натхняеце суайчыннікаў на новыя здзяйсненні. Быць лідарам у сваёй сферы — вялікая адказнасць і вялікая штодзённая праца. Дзяржаўнае прызнанне — гэта высокі давер. Я перакананы, што вы яшчэ не раз апраўдаеце яго новымі дасягненнямі на карысць сваёй Айчыны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

На думку лідара дзяржавы, талент і творчасць усіх узнагароджаных пасля цырымоніі будуць запатрабаваны яшчэ больш і ў працоўных калектывах, і ў краіне ў цэлым.

Ордэнам Пашаны ўзнагароджаны першы намеснік міністра замежных спраў Андрэй Еўдачэнка, начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Асіповіцкім раёне Зінаіда Левачкіна, суддзя суда Ашмянскага раёна Віталь Казакевіч, галоўны трэнер нацыянальнай каманды па самба дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі «Стайкі» Вячаслаў Кот.

Ордэн Францыска Скарыны ўручаны прафесару кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандру Гугніну, члену Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (2003—2019 гады) Аляксандру Самовічу, загадчыку кафедры малюнка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзіміру Тоўсціку, першаму прарэктару Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Святлане Копцевай.

Ордэн «За службу Радзіме» III ступені атрымаў з рук кіраўніка дзяржавы начальнік Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Дэпартамента аховы МУС Ігар Абярэмка, следчы па асабліва важных справах Следчага камітэта Дзмітрый Васюковіч і начальнік Магілёўскага інстытута МУС Валерый Палішчук.

Акрамя гэтага былі прысвоены ганаровыя званні «Заслужаны дзеяч мастацтваў», «Заслужаны дзеяч культуры», «Заслужаны дзеяч навукі», «Заслужаны работнік прамысловасці», «Заслужаны юрыст», «Заслужаны майстар спорту», «Заслужаны работнік адукацыі», «Заслужаны вынаходнік», «Заслужаны работнік транспарту», «Заслужаны работнік органаў пракуратуры», «Заслужаны артыст», «Заслужаны будаўнік», «Заслужаны супрацоўнік органаў унутраных спраў», «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі».

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

«Я вельмі даўно чакала гэтага звання. Мне падабаецца, як яно гучыць, — «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь». Гэта вельмі прыгожа і адказна. Я вельмі ўдзячная за такую высокую дзяржаўную ацэнку. Гэта вялікае шчасце для любога чалавека ў любой прафесіі, калі тваю работу, тое, што ты робіш, заўважаюць, — сказала **Вольга ВРОНСКАЯ, артыст-вакаліст дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы «Маладзёжны тэатр эстрады», заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь.** — Зараз быццам другі віток, быццам хочацца ўздыхнуць глыбей і паляцець, расправіўшы крылы. І пець новыя песні, выхоўваць новых пераможцаў. Хочацца працаваць».

«У любой сферы сельскагаспадарчага комплексу працаваць цяжка. У кожнага свае цяжкасці і свае рашэнні, таму неабходна выходзіць і працаваць у гэтай сферы тым, хто любіць зямлю і людзей. Гэтаксама як і настаўніку, ваеннаму чалавеку неабходна любіць сваю справу — і ўсё атрымаецца, і ўсе цяжкасці можна пераадолець. Гэта ісціна, аксіёма, але гэта праўда», — заўважыў **Рыгор ЧУЙКО, генеральны дырэктар Мінскага раённага ўнітарнага прадпрыемства «Агракамбінат «Ждановічы», заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.**

Заўжды ў поўнай гатоўнасці

У гэтую нядзелю ратавальнікі Беларусі адзначаюць сваё прафесійнае свята. Работнікаў і ветэранаў органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях павіншаваў Прэзідэнт, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

— Знаходзячыся пастаянна ў баявой гатоўнасці, вы абараняеце народны здабытак, стаіце на варце дзяржаўных інтарэсаў, — гаворыцца ў віншаванні. *— Ваша небяспечная праца патрабуе велізарнай мужнасці, стойкасці і самаадданасці. Вы заўжды першыя там, дзе людзі маюць патрэбу ў дапамозе і падтрымцы. Пры гэтым падрыхтоўка і майстэрства беларускіх ратавальнікаў вядомыя па ўсім свеце. Нашы спецыялісты шмат разоў дапамагалі краінам, якія пацярпелі ад прыродных катастроф або ваенных канфліктаў.*

І ўжо па традыцыі перад прафесійным святам у Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях узнагародзілі найлепшых супрацоўнікаў ведамства.

Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка зазначыў: людзі, якія атрымліваюць узнагароды, кожны дзень працуюць над сабой, няспынна павышаюць сваю кваліфікацыю.

— Найбольш цяжка стаць найлепшым начальнікам каравула, ратавальнікам, кіроўцам, — адзначыў Уладзімір Вашчанка. — Натуральна, што гэта хлопцы, якія сумленна адносяцца да справы, тонка ўсведамляюць, куды яны прыйшлі, разумеюць сваю значнасць.

Сярод узнагароджаных — пілот Андрэй Крыштопа і авіяцыйны інжынер Віктар Жылевіч з ДААВУ «Авіяцыя», ратавальнік Ігар Жалткевіч, які працуе ў Глыбоцкім раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях, вадалаз Яўген Мікульскі і ратавальнік-плывец Анатоль Чыслаў з Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння, кіроўца пажарнага аўтамабіля Аляксандр Абрамчук з Маларыцкага РАНС, пераможца конкурсу прафесійнага майстэрства Раман Пяськоўскі (дарэчы, нядаўна пра яго пісала «Чырвонка. Чырвоная змена»).

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэм'ер-міністр Украіны падаў у адстаўку

Прэм'ер-міністр Украіны Аляксей Ганчарук падаў заяву аб адстаўцы на фоне скандальнай «праслушкі» з удзелам кіраўніка ўрада, якая была апублікаваная ў СМІ, паведаміла Euronews. «Каб пазбегнуць любых сумневаў у нашай павазе і даверы да прэзідэнта, я напісаў заяву аб адстаўцы і перадаў яе прэзідэнту з правам унясення ў парламент», — напісаў ён на сваёй старонцы ў Facebook. Прэм'ер падкрэсліў, што апошнім часам грамадскасць стала сведкай «падзей, якія разгортваюцца вакол злітых у сетку файлаў, зманціраваных з фрагментаў запісаў нарад ва ўрадзе», змест якіх штучна стварае ўяўленне пра тое, што кіраўнік урада і яго каманда не паважаюць кіраўніка дзяржавы.

«Многім групам уплыву, якія імкнуцца атрымаць доступ да фінансавых патокаў, выгадна, каб так выглядала. Але гэта няпраўда», — падкрэсліў Ганчарук. Прэм'ер-міністр таксама назваў Зяленскага «ўзорам адкрытасці і прыстойнасці».

Дзясяткі людзей загінулі ў Афганістане і Пакістане з-за снегападаў

Каля 100 чалавек загінулі ў розных раёнах Пакістана ў выніку паводак і сходу лавін, выкліканага магутнымі снегападамі. У зоне бедства ідуць пошукава-выратавальныя аперацыі, для дапамогі і эвакуацыі жыхароў прыцягнуты вайскоўцы і верталёты пакістанскіх ВПС, завалы расчышчаюцца пры дапамозе цяжкай тэхнікі. Груды снегу паралізавалі некаторыя дарогі, што абцяжарвае доступ да пацярпелых раёнаў, дзе разбураныя часткова або цалкам больш за 200 прыватных дамоў і камерцыйных пабудоў. У дапамогу адпраўленыя 2 тысячы палатак і тысяча коўдраў, а таксама 12 тон прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці. Падобная сітуацыя склалася і ў суседнім Афганістане, дзе з-за абвальвання дахаў пад цяжарам снегу загінула сама меней 16 чалавек у правінцыях Герат і Кандагар, парушаны рух транспарту. Аўтатрасу, якая злучае Афганістан з Пакістанам, завaліла снегам. У правінцыі Кандагар паводкі разбурылі не менш за 100 дамоў, каля 4 тысяч чалавек былі вымушаныя пакінуць свае дамы.

Залаты брытанскі саверэн прададзены за мільён фунтаў стэрлінгаў

Саверэн з выявай караля Эдуарда VIII быў прададзены ў ЗША прыватнаму калекцыянеру за 1 мільён фунтаў стэрлінгаў (1,3 мільёна долараў). Ён стаў, такім чынам, самай дарагой манетай у гісторыі Брытаніі. Новы ўладальнік залатой манеты вартасцю 1 фунт стэрлінгаў заплаціў за яе ў мільён разоў больш наміналу. Па словах калекцыянера, які пажадаў не называць свайго імя, ён не мог прапусціць магчымасць, якая надараецца раз у жыцці, і не прывезці з ЗША на радзіму манету з выявай Эдуарда VIII. Усяго было выпушчана шэсць такіх манет. Чатыры такія саверэны знаходзяцца ў музеях, яшчэ два — у прыватных калекцыянераў. Манета з выявай Эдуарда VIII ніколі не паступала ў масавую чаканку і, адпаведна, не была ў звароце. Менш чым праз год пасля ўступлення на трон гэты кароль адрокся ад кароны, каб ажаніцца з разведзенай амерыканкай Уоліс Сімпсан.

Блізкая ўлада

ДЗЯРЖАВА ПАДСТАВІЦЬ ПЛЯЧО

Свой першы прыём на новай пасадзе старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН правёў у Мінскім раёне. І гэтаму ёсць тлумачэнне. «Гэта самы вялікі рэгіён у вобласці і краіне, дзе пражывае больш за дзвесце тысяч чалавек. Тут знаходзіцца вялікая колькасць садовых таварыстваў, адбываецца штодзённая міграцыя з раёна ў Мінск і назад. Усё гэта ўплывае на характар і колькасць праблем. Але важна дакладна іх класіфікаваць. Людзі павінны разумець, дзе дзяржава можа падставіць плячо і выканаць свае абавязацельствы, а дзе зона адказнасці саміх грамадзян», — падкрэсліў Аляксандр Турчын.

Амаль дваццаць жыхароў скарысталіся магчымасцю звярнуцца да старшыні Мінаблвыканкама. Людзей цікавілі пытанні рознага характару.

Двое жыхароў вёскі Шчытомірычы папрасілі пасадзейнічаць ім у абсталяванні тратуара працягласцю 2,5 кіламетра ўздоўж вуліцы Прыдарожнай, бо тут ездзяць машыны вялікай грузападымальнасці, а гэта стварае нязручнасці пешаходам, якія дабіраюцца да аўтобуснага прыпынку.

— Наша задача — забяспечыць бяспеку людзей, — падкрэсліў старшыня Мінаблвыканкама. — Спецыялісты вывучаць сітуацыю, пастараюцца ўладкаваць абочыну дарогі так, каб па ёй быў забяспечаны рух пешаходаў у адпаведнасці з неабходнымі патрабаваннямі. А пакуль падыход да прыпынку будзе арганізаваны па вуліцы-дублёры або па праходах жылой забудовы.

У планах таксама да 1 ліпеня правесці комплексныя работы, з тым каб пусціць па гэтай вуліцы аўтобус. Тады і неабходнасць у руху пешаходаў тут знізіцца.

Шматдзетная маці, якая выхоўвае пяцярых дзяцей, звярнулася з просьбай пасадзейнічаць ёй рэалізаваць сваё права на выкарыстанне сямейнага капіталу, каб дабудаваць дом. Аляксандр Турчын даручыў спецыялістам камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінаблвыканкама дапамагчы жанчыне, растлумачыць ёй, як дзейнічаць у гэтай сітуацыі.

Не абышлося і без зямельных пытанняў. Жыхар аграгарадка Калодзішчы выказаў жаданне пабудаваць дзіцячы цэнтр. Для гэтага яму неабходны зямельны ўчастак, а набываць яго шляхам аўкцыёну мужчына лічыць дарагой працэдурай. Зямля ў Мінскім раёне, як вядома, карыстаецца вялікім попытам і выдзяляецца для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, што цягне за сабой абавязацельствы па іх выкананні.

Традыцыйнымі сталі пытанні па капітальным рамонце дамоў. У аграгарадку Міханавічы з 2016 года не могуць увесці ў дзеянне жылы дом пасля капрамонту, таму што не завершаны работы ў шасці кватэрах. Падрадная арганізацыя спыніла рамонт, бо кампанія-заказчык прызнана банкрутам. Але, як аказалася, ёсць фірма, якая стала яе праваперамнікам. Праўда, тут не ўсё так проста. Жыльцы паспелі зрабіць у сваіх кватэрах перапланіроўку, што магло паўплываць на аслабленне нясучых канструкцый і прывесці да з'яўлення трэшчын на сценах. Аднак старшыня жыллёва-будаўнічага вытворчага кааператыва паказала вынікі абследавання, якія сведчаць, што гэта не так. Спецыялісты дасканала вывучаць пытанне і вызначаць, за чый кошт будуць завершаны работы. Таксама эксперты абласнога ўзроўню па даручэнні старшыні Мінаблвыканкама вывучаць падобную сітуацыю ў аграгарадку Пятрышкі. У гэтым населеным пункце дом здалі ў эксплуатацыю ў 2012 годзе. Па словах старшыні кааператыва, ён «халодны і сыры». І гэта выклікана, на яго думку, недапрацоўкамі з боку будаўнікоў. Цяпер слова — за незалежнымі экспертамі.

Па дапамогу звярнуліся і прадстаўнікі таварыства ўласнікаў. Яны лічаць, што старшыня таварыства немэтазгодна расходуе агульныя сродкі. Такія пытанні часта паступаюць падчас асабістых прыёмаў: людзі хочуць праз органы ўлады дабіцца справядлівасці. Аляксандр Турчын даў даручэнне прызначыць упраўляючага і праверыць работу кіраўніка кааператыва. А затым арганізаваць адкрытыя выбары прэтэндэнта на гэтую пасаду. Людзі павінны самі вызначыць, каму яны давяраюць.

У дзень прыёму грамадзян, 15 студзеня, Мінскай вобласці споўнілася 82 гады. Аляксандр Турчын павіншаваў усіх прысутных са святам і адзначыў, што цэнтральны рэгіён развіваецца значна хутчэйшымі тэмпамі, чым іншыя. І сёння стаіць задача — стварыць рэальную праграму вобласці на пяцігодку, якая дазволіць павысіць дабрабыт грамадзян.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Падарункі

Ад грошай да кніг

Былы банк саступіў месца найстарэйшай бібліятэцы Беларусі

У Гродне справіла навасэлле абласная бібліятэка імя Яўхіма Карскага. Доўгі час яна месцілася ў Новым замку, але плошчаў для яе фондаў не хапала. Свой будынак прапанаваў Нацыянальны банк. Дарэчы, аб'ект быў пабудаваны ў 30-я гады мінулага стагоддзя менавіта як сховішча грошай. Цяпер у былых бункерах будуць захоўвацца каштоўныя выданні XVI—XVIII стагоддзяў.

Фота Міхаіла ЛАПІНА.

У верасні Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Карскага спаўняецца 190 гадоў. Гэта найстарэйшая бібліятэка краіны з багатымі і рэдкімі фондамі. Тут захоўваецца больш за 600 тысяч экзэмпляраў кніг на 75 мовах свету. Нямала эксклюзіўных выданняў знаходзіцца ў аддзеле рэдкай кнігі.

— Мы вельмі задаволены, што бібліятэка атрымала свой будынак, гэта сапраўдны падарунак да юбілейнай даты, — падкрэсліла **дырэктар бібліятэкі Лідзія МАЛЬЦАВА.** — Да гэтага ў нас не было кнігасховішчаў, зараз з 2,5 тысячы квадратных метраў пабудовы фонды займаюць 600 «квадратаў». Акрамя таго, у адным з бункераў на стэлажах 1931 года мы размясцілі рэдкія выданні. У другім бункеры — самыя каштоўныя выданні беларускай літаратуры, яе залаты фонд, які чытаюць ва ўсім свеце.

У новым будынку будуць функцыянаваць чатыры залы, аснашчаныя сучаснай тэхнікай, медыйнымі сродкамі. Тут мяркуецца праводзіць масавыя мерапрыемствы. Абсталяваны дзіцячы пакой з кніжкамі, лялькамі, развівальнымі гульнямі. Ёсць кабінет робататэхнікі, электронная бібліятэка. Пры аддзеле краязнаўства будзе працаваць экспазіцыя, прысвечаная Гродзенскай губерні і вобласці, дзе плануюць экспанаваць найлепшыя рэдкія выданні не толькі з фондаў бібліятэкі, але і з прыватных калекцый гродзенцаў. І такая дамоўленасць ужо ёсць. Напрыклад, падчас адкрыцця бібліятэкі госці знаёміліся з выданнямі, якія прапанаваў вядомы гродзенскі калекцыянер і гісторык Аляксандр Сявенка.

Выставачная зона вельмі прасторная, і, па словах дырэктара, дазволіць больш поўна дэманстраваць наведвальнікам найцікавейшыя кнігі з фондаў бібліятэкі. Таксама тут мяркуюць у поўнай ступені выкарыстоўваць прыгожы дворык з яблыневым садам — праводзіць у ім кніжныя пікнікі і іншыя адмысловыя мерапрыемствы.

Будынак пасля рамонту быў перададзены банкам у другой палове мінулага года. Яшчэ некалькі месяцаў заняў пераезд. Гэта сапраўды вельмі добры падарунак ад банкіраў, адзначыў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ПРАНЮК.** На яго думку, бібліятэка цяпер набывае ў грамадстве новы статус — сацыякультурнай установы, становіцца нечым накшталт універсітэта для ўсіх пакаленняў наведвальнікаў.

Падчас адкрыцця бібліятэкі ўпершыню былі ўзнагароджаны самыя актыўныя чытачы мінулага года. Такую цырымонію тут плануюць зрабіць традыцыйнай.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Раман Наталлі Батраковай — лідар продажаў

Падведзены вынікі кніжнага года ў галіне продажу кніг айчыннай вытворчасці праз сетку крам «Белкнігі» ў 2019 годзе. Лідарам стала другая кніга рамана Наталлі Батраковай «Бясконцасць кахання, бясконцасць смутку», выдадзеная выдавецтвам «Икселент».

За ўвесь год больш чым у 100 крамах, павільёнах, кіёсках ААТ «Белкнігі» прададзена 1466 экзэмпляраў гэтага драматычнага, напоўненага звычайным і часам незвычайным чалавечым жыццём твора. Дарэчы, агульны тыраж менавіта другой кнігі рамана «Бясконцасць кахання, бясконцасць смутку» — 4000 экзэмпляраў. Варта заўважыць, што ў рэйтынгу «Белкнігі» са 100 выданняў айчыннай вытворчасці творы беларускай пісьменніцы (Наталля Батракова і піша, і выдаецца на рускай мове) займаюць восем пазіцый. 88-ю і 89-ю пазіцыі дзеляць паміж сабою першая кніга рамана «Тэрыторыя душы» і першая кніга рамана «Плошча Згоды» — кожнай з іх летась чытачы набылі па 113 экзэмпляраў. Выдавец той жа самы — «Икселент». А на апошнім (для Н. Батраковай, зразумела) месцы — другая кніга рамана «Тэрыторыя душы», якую ў 2019-м набылі 110 чытачоў і адпаведна пакупнікоў «Белкнігі». Усяго ў 2019 годзе «Белкніга» рэалізавала 2358 экзэмпляраў кніг Наталлі Батраковай. Лічба істотная, калі мець на ўвазе, што апошнюю пазіцыю ў рэйтынгу продажаў са 100 кніг беларускай вытворчасці займае выданне, якое ва ўсёй сетцы «Белкнігі» прадалі ў колькасці 100 экзэмпляраў.

Сяргей ШЫЧКО.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

БАНКЕТЫ ЗА ПРЫЛАЎКАМ

За месяц прадавец адной з крам у Віцебскім раёне прысвоіла амаль тры тысячы рублёў. 39-гадовая работніца, з'яўляючыся матэрыяльна адказнай асобай, наладзіла схему «ўцечкі» ў сваю кішэню не толькі грашовых сродкаў з касы гандлёвага аб'екта, але і прадуктаў, у тым ліку спіртнога.

Пры гэтым дзяліла апошнія з мясцовымі жыхарамі. А атачалі жанчыну ў большасці сваёй асобы, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, часцей за ўсё на чарговую сустрэчу яны збіраліся пасля працоўнага дня. Ужывалі, як той казаў, не адыходзячы ад касы. Бяседа была за кошт гаспадыні. Праўда, гуляла жанчына не на свае, а на прысвоеныя. Атрыманая за дзень выручка адрозніваласа ад сумы, якая праводзілася прадаўшчыцай па касавым апараце.

Па выніках праверкі АБЭЗ Віцебскага РАУС, шкода, нанесеная за месяц работніцай прылаўка, склала каля трох тысяч рублёў.

З ЛАМБАРДА — У КАЗІНО

Супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Фрунзенскага РУУС Мінска затрыманы таваразнаўца аднаго з ламбардаў горада, які прысвоіў буйную суму грошай з касы.

У міліцыю звярнуўся супрацоўнік адміністрацыі ўстановы. Ён паведаміў, што ў касе адсутнічае буйная сума, якая засталася з папярэдняй рабочай змены.

Аператыўнікамі было ўстаноўлена, што іх прысвоіў таваразнаўца. Значную частку з якіх у наступным прайграў у ігральнай установе Фрунзенскага раёна. Сума нанесенай шкоды склала больш за 9400 рублёў.

СКРАЛА СРОДКІ З... МАТЧЫНАЙ КАРТКІ

Барысаўскім раённым аддзелам Следчага камітэта заведзена крымінальная справа ў дачыненні да 27-гадовай мясцовай жыхаркі, якая падазраецца ў крадзяжы грошай з крэдытнай банкаўскай карткі.

У аператыўна-дзяжурную службу звярнулася 60-гадовая барысаўчанка. Жанчына растлумачыла, што з яе крэдытнай карткі прапала дзве тысячы рублёў. Прапажу яна выявіла, калі атрымала ліст ад банка аб неабходнасці разлічыцца па крэдыце. Аднак гэтая вестка выклікала ў барысаўчанкі здзіўленне: крэдытнай карткай апошнім часам яна не карысталася.

Пад падазрэнне аператыўнікаў трапіла дачка пацярпелай. Паводле папярэдняй інфармацыі, яна яшчэ ў верасні мінулага года ўзяла з тумбачкі банкаўскую картку, з якой пасля зняла дзве тысячы рублёў. Як паведамляе Барысаўскі РУУС, дзяўчына прызналася ў зробленым і растлумачыла, што ёй спатрэбіліся грошы. Дарэчы, яна паспела іх патраціць на асабістыя патрэбы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СМАЙЛІК... У ПАДТРЫМКУ

СТРАХ ЦІ ГНЕЎ?

— Сацыяльныя сеткі і месенджары як спосабы ўзаемадзеяння займаюць у жыцці сучаснага чалавека вялікае месца, але ні ў якім разе нельга разглядаць іх як яшчэ адну платформу для ўзаемадзеяння з уласнымі дзецьмі: яны толькі памочнікі ў перадачы ці атрыманні інфармацыі, — папярэджвае **псіхолаг сямейных адносін, выкладчык псіхалогіі, спецыяліст па рабоце з падлеткамі Ілляна МАТВІЕНКА.** — Не варта замяняць словы, якія вы асабіста можаце сказаць свайму дзіцяці, абдымкі, якія можаце яму падарыць, прыгожай карцінкай, смайлікам, паведамленнем, дасланым праз месенджар, або каментарыем пад фатаграфіяй, якую размясцілі сын або дачка. Паверце, што ніводны каментарый не заменіць асабістага ўдзелу ў жыцці дзіцяці, тым больш што ў інтэрнэт-прасторы немагчыма «прачытаць» невербальную інфармацыю і дзіця не бачыць вашых эмоцый, вачэй, не чуе інтанацый, што вельмі важна ў наладжванні даверных адносін. Ёсць вялікая імавернасць таго, што паведамленне будзе інтэрпрэтаванае зусім не так, як вы разлічвалі. З падлеткамі высвятленне асабістых адносін нават у афлайне праходзіць няпроста. Да таго ж паведамленне, адпраўленае без двукроп'я і дужкі напрыканцы (аналага смайліка), можа быць успрынятае як вострая заўвага ці негатыўны водгук.

«Але часцей за ўсё дзіця не паспявае пераступіць парог дома, як на яго абрушваецца шквал пытанняў. Дайце магчымасць прыходзіць да вас у той момант, калі яму гэта спатрэбіцца...»

Калі пытаешся ў дзяцей: як думаеш, што адчуваюць твае бацькі, калі сварацца за нейкі ўчынак, — тыя кажуць: «Яны на мяне злуюцца», ці: «Яны ўва мне расчараваныя». Хоць насамрэч, калі дзіця не адказвае прыкладна на 35-ы званок, вамі кіруе зусім іншая эмоцыя — страх, а яны «счытваюць» гэта як злосць, гнеў, расчараванне. І працягваць далейшае абмеркаванне гатовы толькі з пазіцыі абароны — менавіта такой рэакцыі варта чакаць, калі мы пачынаем канфліктаваць з імі ў інтэрнэце.

І зусім недапушчальна, на думку псіхолага, высвятляць адносіны пад фатаграфіяй, якую размясціла ваша дзіця, бо сведкамі становяцца іх сябры. Такім чынам вы самі ствараеце спрыяльную глебу для інтэрнэт-троляў, правакуеце кібербулінг.

— Мы можам няправільна інтэрпрэтаваць пост дзіцяці ў сацыяльнай сетцы і інфармацыю, якую падлетак выстаўляе там на сваёй старонцы. Яна можа нас

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сацыяльныя сеткі — сапраўдны мікрасвет для падлеткаў, у якім яны задавальняюць свае галоўныя патрэбы.

напужаць, усхваляваць, раззлаваць, — папярэджвае Ілляна Матвіенка. — Важны момант — гэта разуменне сацыяльнага кантэксту, у якім дзіця знаходзіцца. Не ведаючы яго, знайсці тлумачэнне таму, што вы ўбачылі ў яго акаўнце, не заўсёды магчыма. Але калі мы не разумеем, што адбываецца, лепш запытацца наўпрост, чым накручваць сябе і хвалявацца. Ні ў якім разе не дасылайце паведамленні кшталту «Я тут убачыла твой пост — дома пагутарым», бо па дарозе з пункта А ў пункт В ваша дзіця перажыве буру эмоцый. Галоўнай задачай для яго будзе не весці з вамі дыялог, не ісці на супрацоўніцтва, не вырашаць праблему, а шукаць апраўданне сваім сённяшнім дзеянням. Дзіця не разумее, што з ім жадаюць абмеркаваць і якім яго ўчынкам бацькі незадаволеныя. І вось гэта яго неразуменне, трывога, прадчуванне высвятлення адносін не пакідаюць шанцаў для канструктыўнага дыялогу.

ЗА ГАРАЖАМІ...

Падрастаючае пакаленне цесна звязана з сучаснымі тэхналогіямі, і гэта ў прынцыпе вельмі падобна на тое, што адбывалася з бацькамі ў іх час, — праслухоўванне музыкі, калекцыянаванне альбомаў, пласцінак, стасункі з сябрамі, чытанне кніг, пошук інфармацыі па вучобе. Проста цяпер усё гэта сканцэнтраванае ў гаджэце. У папярэдніх пакаленняў было «месца за гаражамі», куды яны хаваліся, каб правесці там час з аднагодкамі, а ў цяперашніх дзяцей яго ролю выконваюць сацыяльныя сеткі. Атрымліваецца, што змянілася толькі абалонка, а сутнасць і кантэкст засталіся ранейшыя, таму трэба больш спакойна да гэтага ставіцца і давяраць свайму дзіцяці. Сацыяльныя сеткі, хочам мы гэтага ці не, — сапраўдны мікрасвет для падлеткаў, у якім яны задавальняюць свае галоўныя патрэбы. Нават калі шукаюць інфармацыю, то спачатку спрабуюць знайсці яе там і толькі потым звяртаюцца да пошукавых сістэм.

Каб рэгуляваць уцягнутасць падлетка ў віртуальную рэальнасць, з ім трэба падтрымліваць кантакт і разумець, што адбываецца ў яго рэальным жыцці. І гэта тэма даверных адносін, а не татальнага кантролю і пазбаўлення гаджэтаў.

«Ніводны каментарый не заменіць асабістага ўдзелу ў жыцці дзіцяці».

Асабістую прастору дзіцяці трэба паважаць, не пераступаючы меж ветлівасці і элементарнай адэкватнасці. Найгоршы спосаб кантролю — чытанне асабістых перапісак без дазволу. Рана ці позна дзіця здагадаецца пра гэта, і аднавіць давер будзе практычна немагчыма. Дакучлівае ўварванне ў яго жыццё выкліча адваротны эфект, і з'явіцца жаданне адгарадзіцца ад дарослых, не пасвячаючы іх нават у самыя важныя нюансы свайго жыцця, стварыць патаемны акаўнт пад выдуманым імем. Да таго ж калі бацькі вучаць, што асабістыя межы ў інтэрнэце трэба захоўваць, а затым самі іх бессаромна парушаюць, то як яны выглядаюць у вачах дзяцей?

НЕ НАСТУПАЙЦЕ НА ГРАБЛІ

— Сябраваць з падлеткам віртуальна цалкам магчыма па ўзаемнай згодзе. Выдатна, калі вы знаходзіцеся сярод сяброў свайго дзіцяці ў сацыяльных сетках, можаце праглядаць яго старонку, у вас няма неабходнасці «падглядаць з-за вугла», калі сын ці дачка расказваюць вам, каго і чаму яны запрашаюць да сябе ў сябры. Ненадакучліва прысутнічаючы ў яго электронным жыцці, можна значна глыбей зразумець сваё дзіця. Прамалінейнасць у гэтым пытанні не дапаможа. Лепш выбраць нейтральную пазіцыю назіральніка і ўмешвацца толькі ў сітуацыі крайняй неабходнасці. Можна нават паспрабаваць дамовіцца, што да дасягнення пэўнага ўзросту ў вас будзе сумесны доступ да акаўнта, але трэба таксама адразу дамовіцца, што як толькі дзіця пажадае яго абмежаваць, вы змірыцеся з яго рашэннем, — кажа Ілляна Матвіенка. — Падлетку важна, каб бацькі не ўсё ведалі пра яго пачуцці і думкі. І паступова ўласная тэрыторыя павінна пашырацца.

Ці трэба лезці ў асабістае жыццё іншага, нават вельмі блізкага табе чалавека, асабліва не спытаўшы на тое дазволу? Чым больш даверныя будуць адносіны ў рэальным жыцці, тым менш трывог і асцярог будзе выклікаць у бацькоў магчымы ўплыў сацыяльных сетак.

Лепш дамовіцца з дзіцем, калі яму можна адпраўляць паведамленні ў месенджарах. Уявіце сабе, што калі вы знаходзіцеся на рабоце, вам прыходзіць 57 (!) паведамленняў. Гэта не пераболшанне. Падлетак расказаў, што атрымаў столькі паведамленняў ад маці, калі знаходзіўся ў сябра на дні нараджэння. Тая пыталася ў хлопца, чым яны там займаюцца, які ў яго настрой, ці ўсё яму падабаецца, ці весела яму і гэтак далей. Мяркую, што ўжо на першай гадзіне юнаку хацелася выключыць свой тэлефон. Такой сваёй вар'яцкай навязлівасцю бацькі зусім не спрыяюць наладжванню даверных адносін, а выклікаюць толькі адно жаданне — выкінуць тэлефон і ніяк не рэагаваць. У рэшце рэшт жаданне расказаць пра свой дзень увогуле знікае канчаткова.

Па словах спецыяліста, для малых вельмі важна, каб яны самі вырашалі, што і калі хочуць вам паведаміць. Спраецыруйце сітуацыю на сябе: калі вы вяртаецеся з работы, ці хочацца вам адразу кантактаваць са сваімі блізкімі? Дзеці, якія прыйшлі з нейкага мерапрыемства, настолькі перанасычаны эмоцыямі, што ім таксама патрэбны пэўны час, каб прыйсці ў сябе, а потым яны самі будуць гатовы дзяліцца з вамі ўражаннямі. Але часцей за ўсё дзіця не паспявае пераступіць парог дома, як на яго абрушваецца шквал пытанняў. Дайце магчымасць прыходзіць да вас у той момант, калі яму гэта спатрэбіцца...

Асабістую прастору дзіцяці трэба паважаць, не пераступаючы меж ветлівасці і элементарнай адэкватнасці. Найгоршы спосаб кантролю — чытанне асабістых перапісак.

— Ёсць яшчэ адны граблі, на якія часта наступаюць бацькі, — папярэджвае псіхолаг. — Многія публікуюць на старонках у сацыяльных сетках фота сваіх дзяцей або сумесныя фота. А вы запыталіся ў іх, ці можна гэта рабіць? Дачцэ ці сыну можа не падабацца фатаграфія, якую вы размясцілі ў інтэрнэце, таму трэба найперш пацікавіцца іх меркаваннем. Тым больш калі выцягнулі са свайго сямейнага архіва зусім раннія фота дзіцяці, напрыклад, падчас купання яго галышом. Паверце, будзе бяда... Мы тлумачым дзецям, што нельга размяшчаць фота з сябрамі без іх згоды, а самі што робім? Які прыклад ім падаём? І ўжо што дакладна не трэба рабіць — гэта падпісваць фота, выкарыстоўваючы змяншальна-ласкальныя словы, падлеткі гэта наўрад ці адобраць. Для іх сацыяльныя сеткі — гэта спосаб самапрэзентацыі і самавыяўлення, шкатулка, у якую яны збіраюць усё самае важнае і каштоўнае для сябе, таму не варта псаваць іх інтэрнэт-імідж...

Надзея НІКАЛАЕВА.

❍ Парады для бацькоў

▪ Дзяўчаты-падлеткі часта выкладваюць у сацыяльныя сеткі фота правакацыйнага характару. Не прымайце гэта блізка да сэрца, калі яны ў цэлым не выходзяць за рамкі прыстойнасцяў: кожная дзяўчына хоча быць прыгожай, не саступаць у прывабнасці, у тым ліку сексуальнай, сваім аднагодкам. Проста растлумачце дачцэ розніцу паміж паняццямі «сексуальнае захапленне» і «захапленне прыгажосцю». Няхай сама вырашае, пачуццё якога ўзроўню яна імкнецца выклікаць у прыхільнікаў.

▪ Назіраць за дзіцем праз тэлефон можна нават на адлегласці: у гэтым дапамогуць адмысловыя праграмы, сумяшчальныя са смартфонамі і гаджэтамі і сацыяльнымі сеткамі, якія робяць пазнакі ў геалакацыі. Адзначацца ў «хайповых установах» і грамадскіх месцах для моладзі модна, а для бацькоў вельмі зручна адсочваць па картах горада, дзе зараз знаходзіцца іх крывіначка. Але сын ці дачка павінны даць на гэта згоду.

▪ Каб малы не марнаваў увесь час у пустых перапісках ці гартаючы стужку знаёмых, пакажыце яму ўсе магчымасці інтэрнэту: карысныя праграмы, інфармацыйныя групы, навуковыя, лінгвістычныя супольнасці для асваення замежных моў. Сучасныя інфармацыйныя і адукацыйныя сэрвісы не падобныя на кнігі ў непрывабных вокладках, многія з іх зроблены ў цікавай гульнявой форме.

Каб на Вадохрышча не патануць і не прастудзіцца...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён падкрэсліў, што ў арганізаваных месцах для акунання можна разлічваць на дапамогу выратавальнікаў і ўрачоў хуткай дапамогі, міліцыя будзе ахоўваць грамадскі парадак, у палатках можна сагрэцца і атрымаць гарачую гарбату.

— Штогод мы падлічваем, колькі людзей прыходзіць паўдзельнічаць у абрадзе акунання. У 2018 годзе было больш за 151 тысячу чалавек, летась — больш за 161 тысячу. Сёлета з улікам надвор'я чакаем менш людзей — каля 96—100 тысяч. Усё ж такі акунанне асацыюецца з палонкай, пры наяўнасці лёду яно выглядае больш экстрэмальным, і ў такіх умовах ахвотных больш, — падзяліўся назіраннямі Анвар Ігамбердыеў.

У Мінскай вобласці ўсіх ахвотных гатовы прыняць на 17 выратавальных аб'ектах — чакаецца, што месцы побач з імі наведае каля дзевяці тысяч чалавек, паведаміў **старшыня Мінскай абласной арганізацыі АСВОД Сяргей ПАТРЫКЕЕЎ.** У сталіцы гараджан запрашаюць у прыстасаваныя месцы восем выратавальных станцый.

— У 16 гадзін 18 студзеня мы чакаем усіх ахвотных на станцыі «Камсамольскае возера», а ў 18 гадзін — на станцыі «Дразды». Хочам, каб людзі адчулі свята, таму ў гэты час запрошаны прадстаўнікі царквы, якія правядуць адпаведныя абрады. Каб пазбегнуць стыхійных акунанняў, мы сёлета вырашылі, што нашы выратавальнікі будуць працаваць кругласутачна, — расказвае **выканаўца абавязкаў старшыні Мінскай гарадской арганізацыі АСВОД Дзмітрый СТАСЕЛЬКА.**

Паводле яго інфармацыі, на станцыях «Камсамольскае возера» і «Дразды» сёлета ўпершыню ўстаноўлены пнеўмакаркасныя палаткі з ацяпленнем, побач размешчаны гандлёвыя пункты, дзе можна купіць гарачыя напоі і бутэрброды.

— Попыт нараджае прапанову. Некалькі гадоў таму не было ні палатак, ні гандлю. Мы звярнуліся да адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска, яны дапамаглі з арганізацыяй, — адзначыў Анвар Ігамбердыеў.

Правілы бяспечнага акунання

Тэмпература вады ў беларускіх вадаёмах у гэтыя дні каля 1,5-2 градусаў. Заставацца надоўга ў ёй спецыялісты не раяць. Акунацца пажадана да шыі (апусканне ў ваду з галавой можа выклікаць спазм сасудаў галаўнога мозга), у вадзе не рэкамендуецца знаходзіцца больш за хвіліну. Максімальная колькасць акунанняў — тры па 15—20 секундаў.

Летась у краіне ад усіх відаў утаплення загінула 364 чалавекі, сярод іх 24 непаўналетнія. Штогод выратоўваць удаецца каля паўтысячы чалавек, чвэрць з іх — дзеці і падлеткі. За апошнія пяць дзесяцігоддзяў колькасць загінулых ад утаплення істотна знізілася: у 70—80-я штогод у Беларусі танула больш за паўтысячы чалавек.

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

— Акунанне не павінна быць спантанным рашэннем. Да яго трэба рыхтавацца і маральна, і фізічна. Пажадана пачаць загартоўвацца за некалькі тыдняў і нават месяцаў. Калі ж гэтага не адбылося, перад працэдурай абавязкова варта разагрэцца, зрабіць некалькі фізічных практыкаванняў. А пасля выхаду з вады выцерці цела сухім ручніком, апрануцца ў цёплае сухое адзенне і выпіць цёплую гарбату. У такім выпадку стрэс для арганізма будзе мінімальны, — тлумачыць **намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце РЦ «Хуткая медыцынская дапамога» Алег ВАРАБЕЙ.**

Медыкі не раяць акунацца на Вадохрышча людзям сталага веку і дзецям, а таксама тым, хто мае цяжкія хранічныя і нядаўна перанёс запаленчыя хваробы, пацыентам з захворваннямі сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм. Лепш звярнуцца да свайго ўрача і параіцца, ці не прынясе такая працэдура шкоды вашаму здароўю.

Акрамя гэтага, памятайце, што пры падыходзе да вады трэба заставацца ў абутку, бо, нягледзячы на адсутнасць снегу і лёду, зямля вельмі халодная. Перад акунаннем важна не замерзнуць, таму трэба як мага даўжэй заставацца ў адзенні. У вадзе варта сачыць за сваім самаадчуваннем і за тымі, хто побач з вамі, асабліва звяртаючы ўвагу на дзяцей і пажылых людзей.

Калі вадаёмы пакрыюцца лёдам...

Прадстаўнікі АСВОД нагадваюць, што меры перасцярогі на вадзе варта захоўваць і пры з'яўленні лёду. Рыбакам раяць апранаць выратавальныя камізэлькі, якія не дазволяць сысці пад ваду пры правальванні пад лёд. А таксама быць асцярожнымі пры расстаўленні сетак і памятаць, што ў іх можна заблытацца самому.

— У Верхнядзвінскім раёне на Асвейскім возеры перакулілася лодка з рыбакамі, аднаго з іх удалося выратаваць, двое, на жаль, загінулі. Цяпер манеўрана-пошукавая група шукае целы. Калі б яны былі ў выратавальных камізэльках, яны б выжылі, — кажа Анвар Ігамбердыеў.

Алена КРАВЕЦ.

Не прапусці!

Па слядах воўка. Ноччу...

1—2 лютага грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны», «Воўчы блог» (http://vouk.by) сумесна з Нацыянальным паркам «Белавежская пушча» і Белавежскім нацыянальным паркам Польшчы арганізуюць «Ноч ваўкоў», каб развеяць распаўсюджаныя стэрэатыпы пра іх і натхніць як мага больш людзей далучыцца да аховы роднай прыроды.

У нашым грамадстве да ваўка склалася жорстка негатыўнае стаўленне, і гэта адмоўна ўплывае на стан дзікай прыроды Беларусі. Воўк — драпежнік найвышэйшага парадку, а значыць, ён падтрымлівае біялагічную разнастайнасць і самарэгуляцыю экасістэмы, у якой жыве. Але яго ролю пачаў прымяраць на сябе чалавек. Ён вырашае, колькі і якіх відаў патрэбна канкрэтнаму лесу ці асабліва ахоўнай тэрыторыі. Беспадстаўна перакройваючы экасістэму на свой капыл, чалавек парушае раўнавагу дзікай прыроды, у якой усё ўзаемазвязана.

Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» займаецца вывучэннем сітуацыі па ваўку ў Беларусі з 2013 года. У межах анлайн-кампаніі vouk.by усе могуць паглядзець на свет вачыма звера. Дапамагаюць у гэтым палявыя супрацоўнікі. Яны ўстанаўліваюць фотапасткі, па слядах высочваюць ваўкоў, каб падлічыць іх, робяць генетычны аналіз груповак. Усё гэта дзеля адной вялікай мэты — спыніць татальны адстрэл ваўкоў. У гэтай кампаніі АПБ дапамагае Франкфурцкае заалагічнае таварыства.

Цяпер АПБ і Франкфурцкае заалагічнае таварыства сумесна з Нацыянальным паркам «Белавежская пушча» і польскім Белавежскім нацыянальным паркам **праводзяць першую трансгранічную Ноч ваўкоў.**

Два дні ў Белавежскай пушчы з абодвух бакоў дзяржаўнай граніцы будуць вабіць ваўка, прымяраць на сябе ролю следапытаў. Удзельнікі мерапрыемства даведаюцца пра жыццёвы распарадак, звычкі драпежніка, яго стасункі з чалавекам і членамі сваёй «сям'і».

Кінамастак Ігар Бышнёў пакажа фільмы пра ваўкоў, навуковец і даследчык Дзмітрый Шамовіч прадэманструе «сямейныя» фота з шэрымі, генетык з Польшчы Мацей Шэўчык раскажа, пра што можна даведацца па ДНК ваўка.

У канцы першага дня ўсіх чакаюць вячэрняя экскурсія па слядах ваўка і начное вогнішча на Царскай паляне. Удзел у экскурсіі бясплатны, але па папярэдняй рэгістрацыі на сайце «Аховы птушак Бацькаўшчыны» (https://ptushki.org).

Надзея НІКАЛАЕВА.

Извещение о проведении повторных электронных торгов

Организатор аукциона / оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703
Продавец	ОАО «ЛМЗ Универсал», Минская обл., г. Солигорск, ул. Заводская, д. 4
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов: изолированные помещения, реализуемые одним лотом.
Местонахождение: Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Константина Заслонова, 57–919, 121

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инв. номер
Изолированное помещение (помещение здравоохранения). Доп. информация: помещение находится на 1-м и 2-м этажах, включая подвальный (А1-2/к), имеется навес	1036,3 кв. м	644/D-51662
Одноэтажное кирпичное подвальное помещение (мастерская по ремонту обуви) (коммунально-бытовое помещение). Доп. информация: подвальное помещение с тамбуром, двумя коридорами, двенадцатью комнатами	248,4 кв. м	644/D-29910

Начальная цена (с НДС 20 %): 1 216 653,60 белорусского рубля

Ограничения/обременения: частичная аренда. Подробная информация размещена на сайте www.cpo.by

Порядок ознакомления	Осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.30. Ответственное лицо: Дригель Наталья Викторовна, контактный телефон +375 (29) 176-82-80

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить Организатору торгов вознаграждение в размере 1 (одного) процента он цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 06.11.2019

Дата, время и место проведения электронных торгов	Начало торгов: 03.02.2020 в 10.00. Окончание торгов: 03.02.2020 в 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 31.01.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» сообщает об отмене торгов на право заключения договоров оказания услуг по размещению рекламы на территории станции Минск-Пассажирский, назначенных на 24.01.2020 (извещение опубликовано в газете «Звязда» 21.12.2019).
Телефон для справок +375 (17) 327 40 22.
Адрес в сети интернет **www.mgcn.by.**

УНП 190398583

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Сморгонский завод оптического станкостроения», Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, 80

Предмет аукциона (одним лотом)
Месторасположение: **Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, 80/2**

Наименование (назначение)	Общая площадь, кв. м	Инвентар. номер	Адрес (номер дома)
Здание АБК корпус 23» (1–6-й этажи) (административное помещение)	5540,9	443/D-10855	80/2-1
Административно-бытовые площади к. 23, 1-й этаж» (административное помещение)	300,2	443/D-10865	80/2-3
Административное бытовое помещение корпус № 23 шестиэтажного здания» (административное помещение)	229,5	443/D-11161	80/2-4

Начальная цена с НДС 20 % – 589 201,10 бел. руб. (снижена на 20 %)

***Обременения*:** здание АБК корпус 23» (1–6-й этажи) находится в залоге у банка. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.12.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 29.01.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 28.01.2020** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704-92-06. www.cpo.by. **E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ГОСУДАРСТВЕННОГО ПРЕДПРИЯТИЯ «ЩУЧИНСКАЯ МПМК-166»

Предмет торгов	Начальная цена без НДС, руб.	Размер задатка, руб.
Лот № 1 – грузовой специальный самосвал MAZ 5551 A 2, 2009 г. в., рег. знак АВ 2372-4	4915,93	491,59
Лот № 2 – грузовой седельный тягач MAZ 5432 A 3-322, 2009 г. в., рег. знак АВ 2377-4	5493,51	549,35
Лот № 3 – грузовой седельный тягач MAZ 6422 A8-332, 2008 г. в., рег. знак АВ 0487-4	10 301,68	1030,17
Лот № 4 – грузопассажирский вагон UAZ 39099 4-312, 2008 г. в., рег. знак АВ 0636-4	1774,03	177,40
Лот № 5 – автомобиль МАЗ 5516 А5 АА 6552-4, инв. № 2043	9898,69	989,87
Лот № 6 – растворобетонный узел, инв. № 2050; автомобиль МАЗ 5516 45-371 AI 9135-4, инв. № 1367	83 704,45	8370,45

Продавец	ГП «Щучинская МПМК-166», Гродненская обл., Щучинский р-н, 600 м юго-восточнее дер. Топилишки, УНП 591868177
Организатор торгов	Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
Реквизиты для перечисления задатка	Р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» РД № 100 по Брестской обл., г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи
Условия продажи	Без условий
Информация о возмещении затрат	Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона
Срок заключения договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона	
Аукцион состоится 30 января 2020 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325	
Информацию об аукционе можно узнать по телефонам 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81	
Заявления на участие принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10–329 в раб. дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **29 января 2020 г. до 17.00**	
Ранее извещение о продаже имущества Государственного предприятия «Щучинская МПМК-166» было опубликовано в газете «Звязда» от 30.10.2019 г.	

Извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Ясень» г. Гродно 20 февраля 2020 года

Вид аукциона	Открытый
Предмет аукциона	Автомобиль МАЗ 53366 грузовой фургон тентовый, год выпуска 1999 (замена кабины 2013 год), номер кузова Y3M533660X0008266, регистрационный знак AI 1811-4
Начальная цена продажи	**3 000,00 рублей (с учетом НДС 20 %)**
Место нахождения предмета аукциона	**Гродненская область, г. Гродно, ул. Пучкова, д. 47**
Продавец	Открытое акционерное общество «Ясень», г. Гродно, ул. Доватора, д. 14, тел.: (0152) 55 34 62, 55 34 61
Организатор аукциона	Открытое акционерное общество «Ясень» г. Гродно, ул. Доватора, д. 14 тел.: (0152) 55 34 62, 55 34 61
Дата проведения аукциона	**20 февраля 2020 года**
Время проведения аукциона	**11.00**
Место проведения аукциона	**г. Гродно, ул. Доватора, 14, кабинет директора**
Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов	**г. Гродно, ул. Доватора, 14, кабинет юрисконсульта**
Дата и время начала приема документов	20 января 2020 года 8.30
Дата и время окончания приема документов	19 февраля 2020 года 17.00
Сумма задатка	**300,00 рублей**
Шаг аукциона	5 %

С подробной информацией и предметом аукциона можно ознакомиться по адресу: г. Гродно, ул. Пучкова, 47 (территория магазина № 5 «Строймаркет»), в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 13.30 до 17.00, тел. для справок (029) 253 72 55.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Доватора, 14, кабинет юрисконсульта, в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 13.30 до 17.00.

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Платежное поручение о внесении **задатка** на расчетный счет **BY41-AKBB30120000001704000000** в филиале № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY21400, УНП 500110597 получатель – ОАО «Ясень» г. Гродно, с отметкой банка-отправителя об его исполнении.

2) Копии документов:

юридическое лицо – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов;

индивидуальный предприниматель – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

физическое лицо – паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи (в течение 5 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи). Задаток лица, признанного победителем, засчитывается в оплату полной стоимости.

Победитель аукциона уплачивает ОАО «Ясень» г. Гродно штраф в размере 10 базовых величин в случае отказа в установленный срок от: подписания протокола о результатах аукциона; подписания договора купли-продажи, уплаты суммы, по которой продан предмет аукциона.

РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 06.02.2020 повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 644/С-38902 общей площадью 56,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, садоводческое товарищество «Дружба-Овины», участок 41. Назначение: садовый, дачный домик (дача). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625000000033000017 площадью 0,0475 га. **Начальная цена продажи – 15 033,60 бел. руб., задаток – 1 503,36 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-66172, общей площадью 19,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Симонова, гаражно-эксплуатационный кооператив «Симонова», блок № 16, гараж № 41. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: здание гаража. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 7401000000005003897. **Начальная цена продажи –1 656,00 бел. руб., задаток – 165,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-73344, общей площадью 20,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть, ПГК «Чисть-2007», 35. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: индивидуальный капитальный гараж. **Начальная цена продажи – 1 512,00 бел. руб., задаток – 151,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 4. Изолированное помещение с инвентарным номером 720/D-17406, общей площадью 1137,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Горецкий р-н, г. Горки, ул. Советская, 9-3. Назначение: административно-торговое помещение, наименование: изолированное помещение. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 722050100001001085 площадью 0,1331 га. **Начальная цена продажи – 545 040,00 бел. руб., задаток – 54 504,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708145687, общей площадью 1453,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 11А-4. Назначение: производственное помещение, наименование: производственное помещение. **Начальная цена продажи – 601 344,00 бел. руб., задаток – 60 134,4 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-30393 общей площадью 47,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Молчанова, д. 18. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: одноквартирный жилой дом, составные части и принадлежности: кирпичный и дощатый сараи, остекленная рассадница. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 144500000015000355 площадью 0,0674 га. **Начальная цена продажи – 28 728,00 бел. руб., задаток – 2 872,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Индивидуальный капитальный гараж, инвентарный номер 130/С-(не зарегистрирован в ЕГРНИ) общей площадью 20,7 кв. м, расположенный по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Интернациональная, 12/265. Наименование гаражного кооператива: ГПК № 8, г. Пинск. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 144500000014000024. **Начальная цена продажи – 2 721,60 бел. руб., задаток – 272,16 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Индивидуальный капитальный гараж, инвентарный номер 130/С-(не зарегистрирован в ЕГРНИ) общей площадью 25,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Интернациональная, 12/286. Наименование гаражного кооператива: ГПК № 8, г. Пинск. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 144500000014000024. **Начальная цена продажи – 2 419,20 бел. руб., задаток – 241,92 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-14367 общей площадью 60,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, Стайковский с/с, д. Нехачево, ул. Брестская, 6. Назначение: здание из блоков, облицованных кирпичом одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом № 6. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 123488002601000132 площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 8 100,00 бел. руб., задаток – 810,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 10. Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-85447 общей площадью 21,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, массив гаражей по пер. 2 Бадака (вблизи металлобазы), блок 1, бокс 3. Назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 141000000001001023 площадью 0,0191 га. **Начальная цена продажи – 1 476,00 бел. руб., задаток – 147,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 11. Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-8130,одноэтажный каменный гараж № 134 с подвалом, смотровой ямой, общей площадью 18,3 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, район Орша-Восточная, массив гаражей, гараж 134. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 242400000001002969. **Начальная цена продажи – 2 223,36 бел. руб., задаток – 222,37 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 12. Капитальное строение с инвентарным номером 713/С-9197 общей площадью 46,1 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл, Кличевский р-н, Долговский с/с, д. Долгое, ул. Заречная, д. 60. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом, составные части и принадлежности: одноэтажный бревенчатый жилой дом с холодной пристройкой, двумя сараями. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 723081603101000164 площадью 0,0514 га. **Начальная цена продажи – 4 233,60 бел. руб., задаток – 423,36 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 13. Капитальное строение с инвентарным номером 721/С-400 общей площадью 51,7 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Дрибинский р-н, Коровчинский с/с, д. Полуи. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: одноквартирный жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 722380204101000004 площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 918,00 бел. руб., задаток – 91,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 14. Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-28379 общей площадью 13839,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, 25. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование: отделочно-сборочный корпус. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000008006674 площадью 1,8950 га. Обременения: аренда, ипотека. **Начальная цена продажи – 14 912 586,00 бел. руб., задаток – 1 491 258,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 15. 1.Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-51596, составные части и принадлежности: покрытие, основание, общая площадь – 4416,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007002152 по адресу: г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 100К. Площадь земельного участка – 0,4852 га. Назначение: сооружение специализированное транспорта, наименование – площадка для подготовки водителей автотранспортных средств (автодром).

2. Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-51597, составные части и принадлежности: заполнение, столбцы, цоколь, общая площадь – 540,00 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007002152 по адресу: г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 100К. Площадь земельного участка – 0,4852 га. Назначение: забор кирпичный, наименование – забор кирпичный.

Начальная цена продажи – 90 201,60 бел. руб., задаток – 9 020,16 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

Лот № 16. Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-5233 общей площадью 83,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000009001841 по адресу: г. Бобруйск, пер. Циолковского, 26, площадью 3,6290 (площадь условного земельного участка, принятая в расчетах, составляет 0,0438 га). Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: склад материалов, составные части и принадлежности: сведения отсутствуют. **Начальная цена продажи – 11 907,00 бел. руб., задаток – 1 190,70 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 17. Капитальное строение с инвентарным номером 731/С-8051 общей площадью 112,7 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Климовичи, ул. Железнодорожная, д. 16. Назначение: здание нежилое, наименование: здание автомагазина № 8. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 722850100001004039 площадью 0,0239 га. **Начальная цена продажи – 12 717,00 бел. руб., задаток – 1 271,70 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 18. Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-30735 общей площадью 98,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, СТ Текстильщик-2002, д. 34. Назначение: садовый домик, наименование: садовый домик. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623883700011000061 площадью 0,0411 га. **Начальная цена продажи – 11 070,00 бел. руб., задаток – 1 107,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 19. Капитальное строение с инвентарным номером 320/С-16548, общей площадью 905,4 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Фоканова, 8А. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: одноэтажное здание арочного склада смешанной конструкции. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321850100001000284 площадью 6,7799 га. **Начальная цена продажи – 146 361,60 бел. руб., задаток – 14 636,16 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 20. Недвижимое имущество-жилой дом (назначение-здание одноквартирного жилого дома) с инвентарным номером 600/С-139273 общей площадью 363,7 кв. м, трехэтажный блочный жилой дом, состоящий из первого, второго и мансардного этажей, с цокольным этажом, 2014 г. п. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623687507101000067 площадью 0,2485 га, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Хатежинский с/с, д. Старое Село, ул. Центральная, д. 58. **Начальная цена продажи – 312 480,00 бел. руб., задаток – 31 248,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ.

Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «недвижимость»

Аукцион состоится 06.02.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14А, управление реализации недвижимости и арендных отношений в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений – 03.02.2020 в 15.00.

Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002, г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 6 февраля 2020 года.

Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным

Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01; +375 17 380 27 37; +375 44 763 62 63

Пережирский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области 20 февраля 2020 года в 14.30 в здании Пережирского сельского исполнительного комитета, расположенного по адресу: д. Пережир, ул. Гуриновича, 2а Пуховичского района Минской области, проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации (руб.)	Начальная цена (руб.)	Задаток (руб.)
1	Минская область, Пуховичский р-н, аг. Зазерка, ул. Красный Путь, 25А 624484804601000788	0,1496	Электроснабжение, газоснабжение, ЖД-сообщение	1450,71 + объявление	7162,85	716,29
2	Минская область, Пуховичский р-н, д. Караваево, ул. Садовая, 10 624484805601000379	0,1477	Электроснабжение	1705,02 + объявление	5479,67	547,97
3	Минская область, Пуховичский р-н, дер. Пережир, ул. Совхозная, № 77А 624484807101000628	0,1402	Электр., газ., ЖД-сообщение	2124,82 + объявление	7754,18	775,42

Задаток для участия в открытом аукционе перечисляется на счет: р/с BY2OAKBB36006251300090000000, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНП 600537220 (казначейства), ОКПО 04429668, код платежа 04901, получатель – **Пережирский сельский исполнительный комитет**.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 17.00 14 февраля 2020 года по вышеуказанному адресу.

Осмотр земельного участка на местности проводится (вторник, четверг – 14.00–17.00).

Открытый аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукциона по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.02.2008 г. № 462.

Расходы по организации и проведении аукциона, расходы на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе.
2. Копии платежных поручений, заверенных банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально в случае, если интересы покупателя представляет это лицо.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов подлежат возмещению в порядке, предусмотренном в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Контактные телефоны: (801713) 46-3-96, 46-188, 46-006.

Информация об аукционе размещена на сайте Пуховичского райисполкома.

* В. Бераставіца.

НОВЫ ВЕКТАР РАЗВІЦЦЯ

У канцы мінулага года Бераставіцкі раён увайшоў у бязвізавую зону

Пра тое, што цікавага ёсць у раёне і што будзе зроблена для таго, каб прывабіць турыстаў, мы гутарым са старшынёй Бераставіцкага раённага выканаўчага камітэта Антонам КУЛІСЕВІЧАМ.

— Антон Станіслававіч, Бераставіцкі раён традыцыйна ў ліку перадавых у сельскагаспадарчай галіне. Пра гэта сведчаць і шматлікія ўзнагароды, якія вы атрымліваеце падчас абласных дажынак. Не выключэнне і гэты год. І ўсё ж цяпер вам давядзецца звярнуць увагу і на новы кірунак дзейнасці, звязаны з бязвізавай зонай. Як збіраецеся ў ім працаваць? Якія ёсць для гэтага ўмовы?

— Сапраўды, з 10 лістапада 2019 года Бераставіцкі раён разам з нашымі суседнімі раёнамі стаў бязвізавым. Для гэтага ёсць і перадумовы, бо тут знаходзіцца адзін з найбуйнейшых у вобласці міжнародных пунктаў пропуску, а раён мяжуе з Рэспублікай Польшча. Таму бязвізавыя турысты змогуць адразу ўязджаць на яго тэрыторыю.

У сувязі з гэтым распрацаваны план мерапрыемстваў па развіцці турызму на 2020 год, створана рабочая група па іх рэалізацыі. Тут будуць задзейнічаны розныя ўстановы. Гэта аб'екты грамадскага харчавання, культуры, аховы здароўя. Асаблівая ўвага будзе звернута на прыдарожны сэрвіс, добраўпарадкаванне аўтамабільных дарог і тэрыторыі, якая прылягае да пункту пропуску.

Антон КУЛІСЕВІЧ, старшыня Бераставіцкага райвыканкама.

— Хоць прайшло не так шмат часу, што ўдалося зрабіць? На які кірунак у першую чаргу звяртаеце ўвагу?

— Лічу, што ў першую чаргу трэба забяспечыць інфармацыйнае суправаджэнне. З гэтага, уласна кажучы, і пачалі. Размясцілі інфармацыю на інтэрнэт-сайтах зацікаўленых устаноў, рэгіянальных СМІ, выпусцілі 800 экзэмпляраў тэматычных буклетаў. У аграгарадку Пагранічны каля аўтатрасы ўстанавілі білборд, які інфармуе аб бязвізавай зоне. Зроблены вулічныя карты-схемы турыстычнай інфраструктуры Вялікай Бераставіцы і ўсяго раёна. У хуткім часе дарожныя службы ўстановяць указальныя знакі да значных турыстычных аб'ектаў.

— Чым можа зацікавіць турыстаў ваш раён? Што тут ёсць адметнага?

— Нядаўна ў нас быў распрацаваны цікавы веламаршрут працягласцю 45 кіламетраў, які ахоплівае каля дзесяці знакавых для раёна месцаў. Большасць аб'ектаў — гэта храмы, касцёлы, але не толькі. У маршрут уключаны помнік прыроды мясцовага значэння «Старажытная паркавая сядзіба «Стары Дворац», Верхаўлянскае свяцілішча, мемарыяльныя знакі, устаноўленыя ў памяць воінаў Вялікай Айчыннай вайны. На маршруце ёсць і месцы адпачынку, і аб'екты харчавання. Мяркуецца, што велатурыст зможа адолець гэты шлях за 2,5 гадзіны. У раёне ўсталявана каля дзесяці веласіпедных і пешаходных дарожак.

— Ці ёсць у вас брэндавае свята?

—- Так. І не адно. Летам у нас праходзіць раённае свята «Бераст-Фэст». Гэта свята майстроў. Яны з'язджаюцца з усіх куткоў Беларусі са сваімі вырабамі, праводзяць майстар-класы. Не абыходзіцца без выступлення нашых самадзейных калектываў і зорак беларускай эстрады.

Заваёўвае папулярнасць адкрыты раённы фестываль польскай культуры і побыту «Эйсмантаўскі фэст». Ён пачынаецца са службы ў мясцовым касцёле ў аграгарадку Вялікія Эйсманты. Затым свята пераходзіць на цэнтральную плошчу, дзе падворак «Заможны фальварак» запрашае паспрабаваць нацыянальныя польскія стравы. У аграгарадку Малая Бераставіца вось ужо два гады запар праводзіцца фестываль «Бульба-Мэб». Тут гаспадарыць наш традыцыйны прадукт, арганізаваныя выстаўка-продаж элітных сартоў бульбы, дэгустацыя страў з яе. Яшчэ адзін летні фестываль збірае аматараў суда- і авіямадэльнага спаборніцтва. Тут можна ўбачыць выстаўку мадэляў самалётаў, паветраныя баі, палёты гідрасамалётаў і многае іншае.

— А што цікавага ў вас адбываецца зімой?

— У нас вось ужо другі год працуе рэзідэнцыя старажытнага міфалагічнага беларускага гаспадара зімы — Зюзі і яго гаспадыні Завірухі. Сёлета для наведвальнікаў падрыхтавана анімацыйная праграма-квэст. Рэзідэнцыя знаходзіцца ў дзіцячым летніку, які цяпер задзейнічаны і ў зімовы час. Цяпер тут працуюць не па заяўках, як летась, а сістэмна, у вызначаны дзень і час. На тэрыторыі раёна ёсць пяць аграсядзіб, якія прапануюць нацыянальную кухню, сямейны адпачынак, рыбную лоўлю. Спадзяёмся, што нашымі брэндавымі святамі зацікавяцца і бязвізавыя турысты.

ВАЛАНЦЁРЫ. ПЕРАЗАГРУЗКА

«Трэба, каб дзеці аказвалі дапамогу проста так, а не таму, што ім за гэта нешта будзе»

У Вялікабераставіцкай сярэдняй школе імя С. В. Прытыцкага створаны валанцёрскія атрады рознага кірунку. Увогуле існуе іх тут амаль дзясятак. У адным сабраліся аматары чысціні навакольнага свету, у другім займаюцца пошукавай справай, трэція наогул універсалы... Усе яны аб'яднаны ў валанцёрскае агенцтва, якім кіруе намеснік дырэктара школы Алена Ганчарэвіч. Яна паставіла сабе мэту — перазагрузіць светаўспрыманне дзяцей, каб яны праз рэальныя справы зразумелі нешта важнейшае, чым выгада.

Валанцёрскаму руху ў Вялікай Бераставіцы крыху больш за 10 гадоў. Напачатку ў школе існаваў толькі адзін атрад, які дапамагаў ветэранам і сталым людзям. Удзельнікі атрада наведвалі сваіх падшэфных па неабходнасці. А два гады таму школа ўступіла ў дзяржаўны валанцёрскі інавацыйны праект «Укараненне мадэлі фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў праз арганізацыю валанцёрскай дзейнасці ў сістэме ўзаемадзеяння ўстаноў адукацыі, дзіцячых і маладзёжных аб'яднанняў», які ставіць мэту пашырыць гэты рух. У рамках праекта было створана валанцёрскае агенцтва «Перазагрузка», у якое ўваходзяць дзевяць службаў дапамогі.

Вось, напрыклад, «Універсал». Яны дапамагаюць у правядзенні спартыўных і культурна-масавых мерапрыемстваў як у школе, так і ў вобласці.

Ёсць атрад «Пошук». Яго задача — захоўваць у належным парадку помнікі, мемарыялы. Разам з гэтым вядзецца пошукавая работа. І, трэба сказаць, даволі паспяхова. Нядаўна школьнікам удалося знайсці ўнука генерала Івана Міхайліна. Перад вайной генерал-маёр быў накіраваны на ўмацаванне абарончых збудаванняў заходніх граніц і загінуў літаральна на другі дзень вайны ад асколка падчас нямецкай бамбёжкі. Яго пахавалі каля адной з вёсак. А праз 14 гадоў яго сын пачаў шукаць месца пахавання. Трэба сказаць, што тады гэта работа набыла даволі вялікі маштаб, падключылася вялікая колькасць людзей. Іх намаганнямі тое месца знайшлі, а рэшткі генерала перанеслі ў брацкую магілу. Сённяшнія валанцёры пачалі пошук іншых родных генерала, і ім гэта ўдалося. Яны знайшлі малодшага сына Івана Міхайліна, а таксама яго ўнука Георга, які жыве ў Чэхіі.

— І, ведаеце, дзеці былі вельмі ўзрушаны. Унук Георг пабываў сёлета тут, ён нават не ведаў, дзе пахаваны яго дзед. Зразумела, што гэта падштурхнула атрад да далейшай работы, — заўважыла Алена Мікалаеўна.

Ёсць атрад «Ты не адзін». Гэта дапамога дзецям з абмежаванымі магчымасцямі. Валанцёры наведваюць цэнтр сацыяльнай рэабілітацыі, дзе навучаюцца дзеці з інваліднасцю. Атрад «ЗааСпас» займаецца дапамогай жывёлам і птушкам, на іх рахунку збор кармоў для бадзяжных жывёл.

Побач з ветэранам педагагічнай працы Зінаідай Васілеўнай ШУРБАЙ.

— Ёсць тыя, каму патрэбна дапамога, і ёсць тыя, хто можа гэта зрабіць. Задача нашага праекта — дапамагчы ім сустрэцца, — акрэслівае сваю пазіцыю Алена Ганчарэвіч. — Я бачу, як мяняецца светаўспрыманне дзяцей. Свайго роду перазагрузка свядомасці.

У валанцёрскім руху ў асноўным школьнікі, але ёсць адзін атрад з прыгожай назвай «Сярэбраны дэсант», у склад якога ўваходзяць ветэраны педагагічнай працы. Нехта вядзе мастацкі гурток, хтосьці вучыць кулінарыі. Школьнікі-валанцёры супрацоўнічаюць з БРСМ, Чырвоным Крыжам. Нядаўна валанцёры школы пабывалі ў доме-інтэрнаце для састарэлых, выступілі з канцэртам.

— Дзеці былі пад уражаннем, усе шкадавалі гэтых бабуль і дзядулек, кожны хацеў забраць іх сабе. Цяпер няпросты час, і дзяцей трэба выхоўваць на міласэрнасці, каб яны аказвалі дапамогу проста так, а не чакалі, што ім за гэта нешта будзе. Бывае, што яны прыходзяць і становяцца іншыя, не чакаюць нейкай матэрыяльнай выгады. Бо адчуванне таго, што ты зрабіў нешта добрае, — гэта ўжо выгада. Ад гэтага можна атрымліваць задавальненне, — лічыць Алена Мікалаеўна.

Дзеці, вядома ж, больш накіраваны на тэхналогіі — гаджэты, камп'ютары. Здаецца, хто з іх будзе слухаць бабуль і дзядуль, у якіх, можа, толькі тры класы адукацыі. Так меркавалі ў школе, калі адкрывалі атрад ВНУК. Нават хваляваліся, што ніхто ў яго не пойдзе. Але аказалася наадварот: дзеці гатовы прыходзіць, працаваць у доме і на двары, але, галоўнае, слухаць успаміны. Аказваецца, дзецям гэта цікава, бо ў сталых людзей ёсць багаты жыццёвы вопыт і безліч цікавых гісторый — як з уласнага жыцця, так і сваёй малой радзімы.

Фота дадзена валанцёрскім агенцтвам школы.

Валанцёры за работай.

ВАВЁРКАТЭРАПІЯ ЗНІМЕ СТРЭС

Для жывога сімвала раёна адведзены спецыяльны вальер

Што ўражвае ў Вялікай Бераставіцы, дык гэта мноства выяў вавёрак. І пачынаецца гэта знаёмства адразу пры ўездзе ў гарадскі пасёлак. Бронзавая вавёрка ўзвышаецца на прыгожай кампазіцыі «Дрэва жыцця», што ўстаноўлена ў цэнтры. Металічную канструкцыю ў форме ляснога звярка можна ўбачыць каля дома культуры. Яшчэ аднаго — каля музычнай школы. Здалёк відаць вавёркі-флюгеры на будынках, а на ліхтарах — сцяжкі з той жа вавёркай. Больш за тое, у Вялікай Бераставіцы нават адкрылі музей вавёркі.

Увогуле рабіць акцэнт на вавёрках-манументах не вельмі правільна, бо не так даўно тут далі «кватэру» і жывому лясному звярку. Яго мянушка — Рубін, ён прыбыў з Гродзенскага заапарка і даволі добра адчувае сябе на новым месцы — прасторнай пляцоўцы каля таго самага музея вавёркі.

— І такі задзірысты! Да нас тут прыходзіць сабачка, і мы хвалявaліся, каб ён не спалохаў вавёрку, але атрымалася якраз наадварот. Вавёрка пачала перад ім усялякія акрабатычныя піруэты паказваць, ды так, што наш сабачка сціх і толькі паглядаў на такое дзіва. А ўвогуле наш Рубін да ўсіх падыходзіць, можа нават на плячо ўскочыць, — расказала пра свайго выхаванца выканаўца абавязкаў дырэктара музея Наталля Таргонская.

Такая павага да вавёркі, вядома ж, мае пад сабой гістарычную аснову. Больш за 250 гадоў таму гарадскі пасёлак атрымаў магдэбургскае права і быў зацверджаны яго герб — вавёрка з залатой каронай. Адкуль такая выява? Па адной з версій, у навaколлі расло шмат дубоў і ліп, якія сталі прытулкам для жывёл. Па другой — дачка ўладара населенага пункта Хадкевіча нечым нагадвала вавёрку: доўгія рыжыя валасы, востры позірк, спрытныя рухі. Якая легенда праўдзівая — невядома, але вавёрка ўсё ж вярнулася на герб Вялікай Бераставіцы. А ў хуткім часе тут адкрылі музей, дзе сабрана безліч экспанатаў з выявай ляснога звярка.

Мінулым летам у музейным дворыку з'явіўся вулічны вальер для жывой вавёркі. І, па словах Наталлі Таргонскай, цяпер у музеі асвойваюць новы кірунак — вавёркатэрапію, альбо лячэнне з дапамогай гэтых жывёл. Наведвальнікі могуць не толькі паглядзець на жвавага звярка, але і пакарміць яго і нават узяць на рукі. Супрацоўнікі музея заўважылі станоўчы ўплыў вавёркі на псіхалагічны стан чалавека.

Фота дадзена Музеем вавёркі.

— Аказваецца, яны здольны дапамагчы няўпэўненым у сабе людзям пераадолець замкнёнасць і перамагчы комплексы. А тактыльныя зносіны настройваюць на адкрыты і добразычлівы лад, зніжаюць трывожнасць, эмацыянальную напружанасць і агрэсію, — заўважае Наталля.

Вавёрка так трывала ўвайшла ў жыццё гарадскога пасёлка, што нават нагрудны знак ганаровага грамадзяніна выкананы з выявай звярка. Ім, дарэчы, узнагароджаны адзін з самых вядомых мясцовых краязнаўцаў, супрацоўнік музея Мікалай Пацэнка. А ўвогуле выяву вавёркі маюць на гербе 32 гарады і пасёлкі ў 12 краінах свету, з іх два ў Беларусі. Гэта Вялікая Бераставіца і Акцябрскі Гомельскай вобласці.

Сыры на радасць спажыўцам

Бераставіцкі сырны цэх ААТ «Малочны Мір» высока трымае планку якасці і выпускае надзвычай смачныя сыры

На другім паверсе адміністрацыйнага будынка вытворчага цэха «Бераставіца» ААТ «Малочны Мір» размешчана галерэя ўзнагарод, якіх удастоена прадукцыя прадпрыемства на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах.

На працягу шэрагу гадоў прадукцыя бераставіцкіх сыраробаў разам з іншымі прадуктамі «Малочнага Міру» заваёўвае прызавыя месцы на штогадовай міжнароднай выстаўцы «ХарчЭкспа» ў Маскве, на выстаўцы «Белагра» ў Мінску, на рэспубліканскім

конкурсе «Прадукт года». А на конкурсе «Найлепшы прадукт», які праходзіць у рамках маскоўскай выстаўкі, прадукцыя «Малочнага Міру» ў 2018 годзе атрымала пяць узнагарод. У іх ліку і зялёны сыр «Базірон» з базілікам і часнаком, які нядаўна пачалі выпускаць у вытворчым цэху «Бераставіца».

Павільён прадпрыемства заўсёды карыстаецца папулярнасцю падчас універсальных кірмашоў «Еўрарэгіён «Нёман», якія штогод праходзяць у Гродне. На брэндавым фестывалі сыру прадукцыя бераставіцкіх сыраробаў часта аказваецца ў ліку фаварытаў. Свята ініцыявана кампаніяй «Малочны Мір» і атрымала шырокую папулярнасць сярод беларускіх сыраробаў, якія з'язджаюцца ў Гродна, каб прадэманстраваць свае вырабы.

Сёння на прадпрыемстве «Малочны Мір» вырабляюць каля 300 найменняў прадукцыі, якая паступае ў 40 краін свету. Дарэчы, брэнд «Малочны Мір» добра вядомы спажыўцам на прасторах Расійскай Федэрацыі і не толькі: высокую ацэнку атрымалі сыры прадпрыемства ў краінах Еўразійскага саюза. Таксама прадпрыемства ўнесена ў рэестр вытворцаў малочнай прамысловасці, якія маюць права рэалізоўваць сваю прадукцыю ў краіны Еўрасаюза.

Галоўным сакрэтам поспеху тут называюць якасць прадукцыі. А яна пачынаецца з малака. Менавіта на якаснай сыравіне робяць акцэнт у ААТ «Малочны Мір». З гаспадарак нарыхтоўваецца малако толькі «Экстра» і вышэйшага гатунку.

Другім важным фактарам з'яўляюцца найноўшыя тэхналогіі на ўсім вытворчым ланцужку вырабу сыру. Менавіта гэтыя складнікі дазваляюць адпраўляць на рынак такія смачныя сыры. Дарэчы, тут прыслухоўваюцца да водгукаў спажыўцоў, якія «галасуюць» за тую ці іншую навінку на дэгустацыях падчас кірмашоў. Высока ацанілі яны новы від сыру – «Грэчаскі». Гэтая лінія трымала працяг у выглядзе сырных рулецікаў у спецыяльнай упакоўцы.

Планка ўзнята вельмі высока, і трымаць яе павінны ўсе. Менавіта так лічаць сыраробы вытворчага цэха «Бераставіца», дзе выпускаецца больш за 20 відаў сыроў. Як мінімум 95 % прадукцыі адпраўляецца на экспарт. Сёння, як сцвярджаюць спецыялісты, на гэты прадукт склаліся добрая цана і кан'юнктура. З'явіўся попыт на сыр з працяглым тэрмінам выспявання. І хоць гэта патрабуе даволі вялікіх затрат, але на такія сыры добрая цана, яны даюць прыбытак, маюць высокую рэнтабельнасць. А галоўнае – запатрабаваны спажыўцом.

Сёння ў камерах выспявання чакаюць свайго часу сыры самых розных найменняў. Рэкардсменам па тэрмінах выспявання з'яўляецца папулярны «Пармезан дэ Люкс» – аналаг вядомага італьянскага сыру. Перад тым як трапіць на стол спажыўца, ён пройдзе гадавую вытрымку пад наглядам работнікаў участка.

На працягу паўгода выспявае яшчэ адзін аналаг італьянскага сыру – «Грана Пармезана». Для вытворчасці гэтых сыроў выкарыстоўваюцца закваска і ферменты з Італіі. Бераставіцкія сыраробы стараюцца максімальна наблізіць іх да арыгінала.

Толькі за суткі тут вырабляецца 10 тон сыру розных найменняў. Пастаянным попытам карыстаюцца і традыцыйныя бераставіцкія сыры «Альберы», «Брава», «Бераставіцкі», «Манаршы», «Гранд Талер», «Рачэсцер». На прадпрыемстве выпускаюцца таксама сыры з напаўняльнікам – часнаком і базілікам – «ГородеңЪ». У спажыўцоў таксама карыстаюцца попытам сыры «Сулугуні» і «Грэчаскі».

Шырокая лінейка прадукцыі дазваляе аператыўна перапрафілявацца на найбольш хадавы тавар. З кожным годам пашыраецца і геаграфія паставак, і спіс спажыўцоў. У значнай ступені гэтаму спрыяе тэхнічнае пераўзбраенне прадпрыемства, якое дазваляе не толькі павялічыць магутнасці па перапрацоўцы, але і пашырыць асартымент, палепшыць якасць прадукцыі. Тут імкнуцца да поўнай аўтаматызацыі вытворчых працэсаў, укаранення найноўшых тэхналогій, якія спрыяюць якасці і бяспечнасці прадукцыі.

Значнае абнаўленне праведзена за апошнія гады і ў вытворчым цэху «Бераставіца». Тут змянілі абсталяванне, устанавілі новую

вентыляцыю з фільтрамі. Істотныя сродкі ўкладзены ва ўчастак па наглядзе за сырамі. Камеры, дзе выспявае прадукцыя, абноўлены, пастаўлена абсталяванне, якое падтрымлівае неабходны тэмпературна-вільгатны рэжым. Ёсць планы па далейшай мадэрнізацыі вытворчасці.

Цяпер у вытворчым цэху «Бераставіца» працуе 130 чалавек. Іх унёсак у агульную справу якраз і забяспечвае высокі імідж прадукцыі «Малочнага Міру». А ўсяго на прадпрыемстве сертыфікавана каля 100 найменняў сыру – прадукту, які застаецца адным з самых запатрабаваных на кожным стале.

Фота ААТ «Малочны Мір».
УНП 500040357

МАЛОЧНА-ЯГАДНЫ МІКС «АГРАМІРА»

Што маюць і пра што мараць у адной з буйных гаспадарак Бераставіцкага раёна

Летась сельгаспрадпрыемства «АграМір» адзначыла 70-годдзе. А вось сучасная яго гісторыя пачалася не так даўно, 10 гадоў таму, калі СВК «Бераставічанка» (у мінулым калгас «Чырвоны Кастрычнік») быў рэарганізаваны ў філіял ААТ «Малочны Мір». З гэтага моманту тут сталі адбывацца значныя змены. Пра сучаснае жыццё і планы на будучыню расказаў «Звяздзе» дырэктар сельскагаспадарчага прамысловага прадпрыемства «АграМір» Мікалай ГУЗ.

Дырэктар Мікалай ГУЗ.

– Мікалай Мікалаевіч, якія змены адбыліся пасля таго, як «Малочны Мір» узяў прадпрыемства пад сваё крыло?

– Дзякуючы ўліванню фінансавых сродкаў «АграМір» стаў выходзіць на новы ўзровень. Гэта ў першую чаргу датычылася абнаўлення машына-трактарнага парку, рэарганізацыі малочнатаварных комплексаў. Каб атрымоўваць малако вышэйшага класа і «экстра», пабудавана новая сучасная ферма «Тры сямёркі» з замкнутым цыклам вытворчасці. Сёння мы бачым, што можам пракарміць большы статак, чым ёсць.

– Наколькі выгадна займацца малочнай жывёлагадоўляй?

– Гэта адна з самых прыбытковых галін сельгасвытворчасці. Таму мы вырашылі накіраваць вектар нашага развіцця на павелічэнне малочнага статка і вытворчасці малака. Цяпер у нас амаль 780 дойных кароў, за тры гады мы павялічылі вытворчасць малака з 12 тон у суткі да 16 тон. Удой на карову за мінулы год склаў 7780 кілаграмаў малака. Гэта вышэй за сярэднеабласны паказчык. Сярод 145 гаспадарак вобласці мы займаем 23-ю пазіцыю. Нам ёсць на каго раўняцца: у рэгіёне існуюць гаспадаркі, у якіх атрымліваюць да 10 тысяч кілаграмаў малака. Мы таксама ставім амбіцыёзныя задачы: у першую чаргу давесці статак да тысячы галоў.

Разам з тым ёсць перспектывы ў аграноміі – мы пачалі займацца садам 10 гадоў таму. Цяпер маем больш за 80 гектараў. З іх 15 гектараў – малады сад, які пасадзілі нядаўна у рамках дзяржпраграмы. Гэта шпалерны сад па інтэнсіўнай тэхналогіі. Нам трэба думаць, як зменшыць сабекошт яблыкаў, бо цана іх за апошні час вельмі ўпала – больш чым удвая. Таму трэба зніжаць кошт праз інтэнсіўнасць, ураджайнасць. У нас будуецца фруктасховішча на 1 тысячу тон прадукцыі, аб'ект узводзіцца пры дапамозе нашага галаўнога прадпрыемства «Малочны Мір». Будоўля хутка завершыцца. Гэты кірунак таксама лічу перспектыўным для гаспадаркі.

Юлія МАТСАПАЕВА.

Машыніст-трактарыст Яўген ПІЧКОЎСКІ.

– З сартамі яблыкаў таксама вызначыліся?

– Як аказалася, нашы цудоўныя беларускія сарты «Поспех», «Заслаўскае», «Беларускае салодкае», якія я лічу аднымі з самых найлепшых, чамусьці страцілі папулярнасць. Спажывецкі густ сёлета засяродзіўся на сорце «Гала». Гэта чырвоны яблык, прычым не з танных. Але ён папулярны ў спажыўцоў.

– Можа, рэч у маркетынгу?

– Згодны, сапраўды, маркетынг у нас, мякка кажучы, кульгае: вырошчваць мы ўмеем, прычым якасную прадукцыю, аднак прадаць яе адпаведна не ўмеем. Можа, таму, што раней гэтым займаліся цэнтралізаваныя структуры, якія ўсё забіралі і збывалі. Сёння іншы падыход: мала атрымаць добрую прадукцыю, трэба яшчэ яе прадаць, быць у трэндзе, рэкламаваць. І тады на кожны яблык будзе попыт. Напрыклад, сёлета многія пыталіся пра антонаўку і нават белы наліў. Кажуць: хочам вярнуць смак дзяцінства. Таму трэба думаць на будучыню.

Аператары машыннага даення Алена МІЛАШЭЎСКАЯ і Марыя МАРЫНАВА.

– Ці ёсць месца ў будучыні ягаднаму міксу? Сёння, здаецца, гэта таксама нядрэнны кірунак...

– У нас ёсць 100 гектараў пад ягадныя кусты. Вырошчваем чорныя парэчкі, аронію – чарнаплодныя рабіны, маем агрэст, маліны. Дарэчы, маліны адразу разыходзяцца. Асабіста мне падабаецца агрэст – няма смачнейшага варэння, чым з гэтай ягады. Гэта беларускі інжыр. У нас ёсць чырвоныя сарты агрэсту, ён салодкі, духмяны, не цвёрды. І нашых беларускіх сартоў. Ён таксама добра разыходзіцца, можа, таму, што гэтай культурай мала хто займаецца.

– І дзе можна набыць вашу смачную ягаду?

– Проста ў нас у садзе. Многія ведаюць і прыязджаюць купляць. Мы прадаём і невялікім оптам – самім везці на рынак 5–10 латкоў затратна, і няма такой магчымасці.

– Чаго вы хацелі б пажадаць сваім работнікам?

– Здароўя. У нас добрая каманда, амаль кожны трэці – гэта моладзь да 31 года. Разам з тым кіраўніцтва з павагай ставіцца да тых, хто многа гадоў жыцця аддаў рабоце на сельгаспрадпрыемстве. Спадзяюся, што і надалей мы будзем разам, каб здабываць наш агульны дабрабыт.

Фота «АграМіра».
УНП 500826899

ДЛЯ АЛІЎЁ І НЕ ТОЛЬКІ...

Чаму трэба пакаштаваць бераставіцкія яйкі

Самым першым пытаннем падчас наведвання птушкафабрыкі ў Вялікай Бераставіцы было: вы каштавалі нашу прадукцыю? Прызнаюся, такі пачатак размовы быў нечаканы. Пры сённяшніх даволі разнастайных прапановах цяжка засяродзіцца на чым-небудзь адным. «А вы паспрабуйце! – настойваў дырэктар Міхаіл Груздзеў. – Абавязкова паспрабуйце. Вам спадабаецца».

Здаецца, звычайны маркетынгавы ход, з якімі спажывец сустракаецца на кожным кроку. Адносіцца да такіх прапаноў можна па-рознаму: хтосьці адмахнецца, а для іншага яна стане падказкай. У любым выпадку, каб скласці сваю думку, варта прыслухацца і самому ацаніць смак прадукту. А можа, і сапраўды гэта слушная прапанова?

Вось на такой хвалі і пачалося знаёмства з кіраўніком аднаго з найбуйнейшых прадпрыемстваў Бераставіцкага раёна. Літаральна праз некалькі гадоў птушкафабрыка адзначыць сваё 60-годдзе. Некаторыя будынкі працуюць да гэтага часу, але прайшлі значную мадэрнізацыю. Інакш нельга: у птушынай гаспадарцы трэба захоўваць максімальную чысціню і выконваць санітарныя нормы.

За гэты час прадпрыемства значна ўзбуйнілася. Калі раней нясушкі размяшчаліся на адным ярусе, дык цяпер іх чатыры. Утрыманне кур-нясушак клетачнае, усе працэсы механізаваны – кармленне, паенне, выдаленне памёту.

Цяпер на прадпрыемстве 150 тысяч пярэстых курачак, якія стабільна выконваюць свой «рабочы» план – штодзень нясуць па яйку. Збор яек адбываецца двойчы ў змену. Жанчыны-птушніцы бяруць іх з канвеернай стужкі і складваюць у латкі. Затым далікатная прадукцыя адпраўляецца ў цэх сарціроўкі. Тут яе размяркоўваюць па катэгорыях – вышэйшая, адборная, першая, другая, яйка дыетычнае, сталовае. Адпаведна запаўняюцца вялізныя скрыні на 360 яек. Такіх скрынь за суткі набіраецца да паўтысячы, а часам і 700–800. Рэалізацыя яек – галоўная частка даходу прадпрыемства.

Вядома, расходы таксама значныя – утрыманне птушкі справа нятанная. Большасць сродкаў ідзе на закупку кармоў. Па словах дырэктара, сёлета іх набылі дастаткова, і гэты працэс працягваецца. Таксама два разы на год фабрыка закупляе сутачных куранят, якія замяняюць асноўны курыны статак. Працэс гэты ідзе паэтапна. Пры замене дарослыя куры рэалізуюцца насельніцтву.

– Кожная перасадка – даволі працаёмісты працэс, – заўважае Міхаіл Іванавіч. – Амаль месяц будучыя «кватэры» праходзяць спецыяльную апрацоўку, чыстку, дэзынфекцыю. Пры неабходнасці вядзецца замена абсталявання ці яго рамонт. У нас цяпер цалкам адноўлены адзін цэх.

Ёсць, вядома, і свае мінусы – напрыклад, сезоннасць. Заўважана, што попыт зніжаецца летам. Але з такой сітуацыяй сутыкаюцца многія вытворцы, таму яны шукаюць дадатковыя рынкі збыту. Дарэчы, у краіне і сапраўды атрымліваецца больш яек, чым патрабуецца, прычым на 25 %. Гэта значыць, што прадукцыю трэба рэалізоўваць за межамі Беларусі. Бераставіцкая птушкафабрыка, як і многія іншыя, актыўна працуе з расійскімі партнёрамі.

А чым харчуецца птушка? Бо рацыён, як вядома, адбіваецца і на смаку яек. Як паведамілі на фабрыцы, асноўным кампанентам корму з'яўляюцца збожжавыя культуры. Для таго каб нясушка мела добрую энергетыку, у структуру кармлення ўключаюцца такія кампаненты, як вапна, рапсавы алей, шрот, соя, кармавыя дрожджы, ракушнік, таму што з кожным яйкам з арганізмам птушкі вымываецца 20–30 % кальцыю, запасы якога трэба папоўніць.

Птушкафабрыка поўнасцю перайшла на пярэстых нясушак пароды хай-лайн. Раней былі і белыя, але попыт больш схіляўся менавіта да каляровага яйка, таму ў рэшце рэшт яны сталі дамінаваць.

Дзе можна набыць бераставіцкую прадукцыю? У прадпрыемства ёсць свой фірменны гандаль. Дзве крамы знаходзяцца ў Вялікай Бераставіцы, ёсць тры гандлёвыя месцы ў Гродне на Скідзельскім рынку, на міні-рынку новага мікрараёна Альшанка.

Алена КУРМЕЛЬ атрымлівае падзяку падчас абласных дажынак.

Пастаянна выязджае спецыялізаваны аўтамабіль – павільён на колах, які развозіць прадукцыю птушкафабрыкі па вобласці.

На прадпрыемстве, згодна з калектыўным дагаворам, працуе бонусная сістэма для работнікаў. Яны кожны месяц могуць набыць тры латкі яек (90 штук) па сабекошце. Таксама для работнікаў створаны добрыя бытавыя ўмовы, ёсць памяшканне для прыёму ежы з халадзільнікам, мікрахвалевай печкай і нават тэлевізарам. Зарплата таксама нядрэнная – у сярэднім 805 рублёў. Для Бераставіцкага раёна гэта даволі высокі паказчык.

Асноўны кантынгент работнікаў – жанчыны. І, трэба сказаць, многія маюць добрыя вынікі ў працы. Гэта адлюстроўвае і мясцовая Дошка гонару. Дасягненні некаторых работнікаў ушаноўваюцца і на абласным узроўні: сёлета падчас абласных дажынак у Смаргоні аператар птушкафабрыкі Алена Курмель заняла першае месца сярод птушніц Гродзеншчыны.

Дзякуючы такім работнікам, як і многаму іншаму, мы можам атрымаць да свайго стала такую патрэбную прадукцыю. Цяпер я ведаю, якімі яйкамі скарыстаюся, калі буду гатаваць стравы да святочнага стала, – вядома ж, бераставіцкімі!

УНП 500008588

КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ КАМФОРТ

У такім кірунку працуюць на Бераставіцкім прадпрыемстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі

Можна не перабольшваючы сказаць, што без работнікаў камунальнай службы проста нельга ўявіць сабе жыццё цывілізаванага грамадства. Менавіта яны забяспечваюць камфортнае пражыванне і ствараюць спрыяльнае асяроддзе паўсюдна, дзе б ні жыў чалавек. Аб тым, як працуе прадпрыемства ЖКГ Бераставіцкага раёна, расказаў яго дырэктар Віктар Заміроўскі.

Начальнік Бераставіцкага РУП ЖКГ Віктар ЗАМІРОЎСКІ.

– Адной з галоўных задач у сферы ЖКГ з'яўляецца цеплазабеспячэнне. Як вы яе вырашаеце?

– У раёне падачу цяпла забяспечваюць 22 крыніцы. Усе яны падрыхтаваны і стабільна працуюць у асенне-зімовы перыяд. Пасля завяршэння ацяпляльнага сезона ўсе кацельныя праходзяць праверку і, пры неабходнасці, уключаюцца ў планавы ці капітальны рамонт. Летась мы правялі мадэрнізацыю кацельнай у вёсцы Лясная, дзе замянілі агрэгаты на аўтаматыку.

Штогод стаіць задача замяніць не менш за 4 % цеплавых сетак, і мы з гэтым спраўляемся. Летась такая работа праведзена ў некалькіх аграгарадках і раённым цэнтры. Гэта дазволіла значна знізіць страты цяпла. А ўсяго ў раёне 80 кіламетраў цеплатрасы, якая забяспечвае спажыўцоў цеплавой энергіяй.

– Што робіць жыллёвая гаспадарка, каб даць жыхарам якасную пітную ваду?

– Як вядома, у краіне стаіць задача да 2025 года забяспечыць спажыўцоў якаснай пітной вадой. На гэта накіравана і наша дзейнасць. Трэба сказаць, што пэўныя крокі ў гэтым кірунку ўжо зроблены. Літаральна нядаўна ў аграгарадку Масаляны ўведзена станцыя абезжалезвання магутнасцю 150 кубічных метраў у суткі. Гэты аб'ект жыхары даўно чакалі. Летась такія ж станцыі здадзены яшчэ ў двух аграгарадках.

– На якія праблемы будзе звернута ўвага ў найбліжэйшы час?

– Трэба паляпшаць сітуацыю з водаправодам, які перадаецца ад іншых арганізацый. Нядаўна мы прынялі на свой баланс пяць кіламетраў водаправодных і дзесяць кіламетраў каналізацыйных сетак. Зразумела, што многія знаходзяцца ў даволі дрэнным стане. Таму будзем займацца іх заменай.

Вялікі аб'ём работ у сувязі з гэтым трэба выканаць у аграгарадку Пагранічны. У паўднёвай частцы, дзе водаправод належаў Баранавіцкаму аддзяленню чыгункі, свідравіна і воданапорная вежа эксплуатуюцца з 50-х гадоў, іх знос склаў 70 %. Мы прынялі іх на свой баланс, будзем рабіць тры новыя артэзіянскія свідравіны і новую вежу, а таксама мяняць дзесяць кіламетраў водаправода. Цяпер вядзецца распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі. Займаемся таксама аўтаматызацыяй асобных працэсаў. У прыватнасці, у аграгарадках на аўтаматыку пераводзяцца каналізацыйна-помпавыя станцыі, што спрыяе як зніжэнню затрат, так і паляпшэнню якасці абслугоўвання.

Работнікі ЖКГ падчас раённага дня аховы працы.

– Дарэчы, пра затраты. Для спажыўцоў важна, каб кошт паслуг не вельмі біў па кашальку. Разам з тым вам таксама трэба існаваць, развівацца. Якім чынам дасягаецца кампраміс?

– Мы пайшлі па шляху зніжэння сабекошту паслуг. Складзена цэлая праграма. Адным з кірункаў стаў новы від дзейнасці – будаўніцтва. На прадпрыемстве з'явіўся і новы ўчастак – рамонтна-будаўнічы, які атрымаў неабходныя атэстаты для выканання даволі значнай колькасці будаўніча-мантажных работ. Таксама заняліся і рэалізацыяй будаўнічых матэрыялаў.

Уласнымі сіламі адрамантавалі адміністрацыйны будынак, кабінет аховы працы, абсталявалі гардэроб, душавыя, пакой для яды і яшчэ некаторыя памяшканні. Працуем і на іншых аб'ектах. Напрыклад, у Вялікай Бераставіцы здзейснілі пілотны праект па рамонце парыльнай небяспекі. Нядаўна на базе прадпрыемства прайшоў раённы дзень аховы працы, падчас якога спецыялісты наведалі некалькі кацельных. Так, у аграгарадку Алекшыцы была прадэманстравана правільная тэхнічная эксплуатацыя высокаэкаэфектыўнага катла, які працуе на драўляных трэсках. Таксама звяртаем увагу на патрабаванні па складзіраванні і захоўванні мясцовых відаў паліва. Нашы спецыялісты пастаянна праходзяць інструктаж пры рабоце на праезджай частцы дарогі. Тут вельмі важна правільна паставіць дарожныя знакі, праверыць наяўнасць газаў у калодзежы і бяспечна выканаць неабходныя работы.

Фота Бераставіцкага РУП ЖКГ.

УНП 500020708

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Маргарыта УШКЕВІЧ.

Іван ЛІТВІНОВІЧ:

«Я ЗЛАМАЎ СКІВІЦУ СВАІМ ЖА КАЛЕНАМ»

У краіне з'явілася новая зорка батутнага спорту. Як хлопец з Вілейкі абыгрывае славутых кітайцаў

Чэмпіянат свету па скачках на батуце ў канцы 2019 года ў Токіа прынёс адразу некалькі нечаканых вынікаў. У фінал індывідуальных спаборніцтваў не прайшоў алімпійскі чэмпіён Уладзіслаў Ганчароў, але ў ліку наймацнейшых яго замяніў іншы беларус — 18-гадовы Іван Літвіновіч. Батутыст з Вілейкі заявіў пра сябе яшчэ на юніёрскім узроўні, стаўшы чэмпіёнам Еўропы, а вось на дарослым чэмпіянаце свету спартсмен выступаў другі раз і, акрамя асабістай узнагароды — «серабра» ў індывідуальных практыкаваннях, — атрымаў «золата» ў камандным турніры і заваяваў алімпійскую ліцэнзію. Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Вольга Уласава кажа, што за тры гады з брыдкага качаняці Літвіновіч ператварыўся ў прыгожага лебедзя, і ў яго ёсць усе шанцы паўтарыць шлях Уладзіслава Ганчарова, каб стаць алімпійскім чэмпіёнам. Пра тое, ці паедзе Іван у Токіа гэтым летам, канкурэнцыю ў беларускай зборнай і першага трэнера-маму ён расказаў у сваім інтэрв'ю.

— Да чэмпіянату свету здавалася, што самы важны турнір у маёй кар'еры — юнацкія Алімпійскія гульні, — пачынае размову Іван. — Але цяпер ужо гэта, вядома, планетарнае першынства. Калі ляцелі ў Токіа, разлічваў дайсці да фіналу, для мяне гэта ўжо было б поспехам, але калі трапіў туды, думаў ужо пра іншае: як бы ўтрымаць другое месца. Дзякуй богу, атрымалася.

— Для вас было нечакана, што лідар нашай каманды не кваліфікаваўся ў фінал?

— Так, гэта было здзіўленнем. Я нават трохі пачаў панікаваць, таму што застаўся ў фінале адзін. На папярэднім чэмпіянаце свету мы абодва трапілі ў вырашальны раўнд, і тады Улад мяне вельмі падтрымліваў, супакойваў, а цяпер я адчуваў сябе крыху не ў сваёй талерцы.

— Якія задачы стаяць перад беларускай камандай у 2020 годзе?

— У нас будуць чатыры этапы Кубка свету, чэмпіянат Еўропы і Алімпіяда, пакуль рыхтуемся да гэтых стартаў, таму да Гульняў у Токіа ў нас вельмі шчыльны графік.

— Атрымліваецца, што алімпійскую ліцэнзію заваявалі вы, а адправіцца ў Токіа можа і іншы спартсмен. Гэта крыўдна?

— Пакуль што ў нас усяго адна ліцэнзія, але Улад Ганчароў можа зарабіць яшчэ адну на этапах Кубка свету, тады на Алімпіядзе выступяць два беларусы. Хто паедзе туды, вырашыць трэнер, і мне здаецца, адбор будзе праходзіць па гэтых этапах Кубка свету і чэмпіянату Еўропы. Да таго, што ліцэнзія можа быць не мая, раней ставіўся спакойна, думаў, што на Гульні павінен паехаць самы дасведчаны спартсмен, таму што я магу і разгубіцца. А цяпер ужо лічу, што можна пастарацца і пазмагацца за права на пуцёўку, не хочацца аддаваць яе нікому.

Беларуская каманда ў складзе Івана ЛІТВІНОВІЧА, Уладзіслава ГАНЧАРОВА і Алега РАБЦАВА.

— Што на чэмпіянаце свету было даражэйшае для вас: «золата» ў камандным турніры або індывідуальнае «серабро»?

— Вядома, «серабро», бо на Алімпіядзе прадстаўлена толькі індывідуальная праграма, ні камандных, ні сінхронных спаборніцтваў там няма. Прыемна таксама, што атрымалася ўзяць алімпійскую ліцэнзію для Беларусі: калі я прайшоў у фінал, супакойваў сябе тым, што ёсць хоць гэтая пуцёўка — ужо штосьці, прыеду не з пустымі рукамі.

— На п'едэстале вы размясціліся паміж двума кітайцамі. Ці прыемна выйграць у чатырохразовага прызёра Алімпійскіх гульняў Дон Дона?

— Я наогул не думаў пра яго, калі выступаў, а вось калі мы ўжо стаялі на п'едэстале, я апынуўся побач са сваім кумірам Гао Леем, які выйграў «золата», падумаў: вось нарэшце будзе сумеснае фота. Але паўтаруся, скачучы, я не звяртаю ўвагі на сапернікаў, успрымаў гэта як трэніроўку.

— Пасля поспеху на чэмпіянаце свету ў вашым жыцці нешта змянілася?

— У трэніровачным працэсе не, адзінае, што змянілася, — гэта тое, што пачалі тэлефанаваць журналісты і пісаць пра мяне *(смяецца)*.

Іван на п'едэстале чэмпіянату свету.

Вольга Анатолеўна прамалінейная, нічога не баіцца сказаць у вочы, і гэта вельмі класна, настойлівая, можа быць і мяккай і цвёрдай, часам здаецца, што яна бачыць свет па-іншаму. Напэўна, гэта і ёсць яе сакрэт поспеху.

— Вы пачалі займацца скачкамі на батуце ў родным горадзе і ўжо з'яўляецеся самым тытулаваным прадстаўніком спартыўнай школы ў Вілейцы...

— Пачынаў я наогул са скачкоў на дарожцы, займаўся ў мамы акрабатыкай, яна ў мяне трэнер. Працуе з дзецьмі ў роднай школе і сёння. Потым, як расказвала мама, праходзілі нейкія спаборніцтвы, майму першаму трэнеру па скачках на батуце не хапала аднаго хлопчыка, якраз майго ўзросту, вырашылі паспрабаваць мяне. Падрыхтавалі літаральна за пару дзён, проста для каманды, а потым неяк так і зраслося, я застаўся. Мама прынесла мяне ў залу ў два ці тры месяцы, калі сама выйшла на работу. Калі б не яна, я ўжо даўно завяршыў бы са спортам, яна мяне ўвесь час прымушала займацца. Не магу сказаць, што спорт не прыцягваў, але хацелася пагуляць з сябрамі, а ў самы цікавы момант тэлефанавала мама і казала, што трэба на трэніроўку. Я выдумляў, што трэба рабіць шмат урокаў у школу, але яна ўсё гэта разумела, прыязджала і забірала мяне. Цяпер бы ўжо сказаў, што мама-трэнер — гэта плюс, а тады лічыў наадварот. Сёння разумею, што яна ўсё правільна зрабіла, і ўдзячны ёй за тое. Дарэчы, цяпер кінуць спорт нават думак не ўзнікае, не хачу нічога мяняць у сваім жыцці.

— Як мама рэагавала на вашы першыя поспехі?

— Поспехі з'явіліся не адразу, я займаўся батутам з васьмі гадоў, да шаснаццаці ніякіх вынікаў не паказваў. У краіне мог быць трэці, вельмі часта чацвёрты і вельмі рэдка другі. Калі перайшоў да Вольгі Уласавай, усё стала атрымлівацца. Што датычыцца мамы, яна заўсёды казала, што ў мяне ёсць усё для поспехаў у спорце, але ведаю дакладна, што мама не глядзела ў прамым эфіры ні адны мае спаборніцтвы. Затое потым, калі ўсе ўжо выступяць і яна ведае вынік, пачынае крытыкаваць. Часцей за ўсё прапускаю гэта міма вушэй, яна ж не трэнер па батуце. Але пасля «серабра» на чэмпіянаце свету мама сказала, што ёй спадабалася выступленне, «касякоў» не было.

— Пасля паспяховага чэмпіянату свету вы прыязджалі ў сваю родную спартыўную школу. Як вас там сустрэлі?

— Мне заўсёды прыемна туды вяртацца. Стараюся не паказваць гонар за свае перамогі, але там так не атрымліваецца, таму што маленькія дзеці глядзяць на мяне ўжо як на чэмпіёна. Нават не па сабе робіцца. Трэнеры спакойна павіншавалі мяне, дырэктар быў вельмі рады, ён глядзіць кожную трансляцыю, хварэе, перажывае. Кажуць, што пасля майго «серабра» на чэмпіянаце свету бацькі прывялі на секцыю некалькі новых дзяцей *(усміхаецца)*. Гэта прыемна, таму што дзіцячыя групы ў параўнанні з тым, што было, калі пачынаў займацца я, зменшыліся. Дзеці сталі іншыя, калі штосьці не атрымліваецца, адразу сыходзяць, і бацькі не настойваюць, каб тыя працягвалі заняткі.

— Што для вас сёння найбольш складанае ў спорце?

— Мне не хапае цярпення. Цяпер, напрыклад, трэба худзець, каб лягчэй было скакаць. Я нічога не ем, атрымліваецца, ад гэтага не сплю, а стомленасць назапашваецца. Калі штосьці не атрымліваецца шмат разоў, пачынаю выходзіць з сябе, псіхаваць, не хачу скакаць. Пачынаю рабіць нейкія іншыя элементы, праз гэта мяне могуць выгнаць з трэніроўкі. Я разумею свае памылкі, потым прашу прабачэння ў трэнера.

— Часта батутысты адзначаюць, што скачкі становяцца наркотыкам.

— Гэта праўда, тыдзень можаш адпачыць, а потым ужо разумееш, што трэба скакаць. Гэта як смага. Калі робіш новыя складаныя элементы, атрымліваеш адрэналін.

— Скачкі на батуце — досыць траўманебяспечны від спорту...

— Аднойчы я зламаў сківіцу сваім жа каленам. Прызнаюся, не чакаў, усе звычайна ламаюць рукі, ногі. Я проста рабіў элемент, расслабіўся, апусціў галаву і ўбачыў, што калена ляціць у твар. Спачатку ўсміхаўся, а сківіца не злучалася — прыкольна. Потым убачыў маму ў слязах, яна плакала і смяялася адначасова.

— Якія рысы характару дапамагаюць вам дамагацца поспехаў?

— Настойлівасць: калі я сказаў, што павінен зрабіць які-небудзь элемент, значыць, павінен прыйсці і зрабіць. Не выйду з залы, пакуль трэнер не прагоніць. Пасля Алімпіяды ў Рыа пачаў сачыць за Уладам Ганчаровым, бо мы трэніруемся разам. Стаў пераймаць у яго нейкія рысы характару, глядзець, як ён робіць нейкія элементы. Запомню, паспрабую — і разумею, што так сапраўды лягчэй. Таму ў чымсьці, нават па рысах характару ў зносінах, мы становімся з ім падобныя.

«Калі робіш новыя складаныя элементы, атрымліваеш адрэналін».

— Якіх вышынь вы марыце дамагчыся ў спорце?

— Хацелася б выйграць усе самыя прэстыжныя спаборніцтвы, такія, як Кубак свету, чэмпіянат свету, чэмпіянат Еўропы, а потым, вядома, Алімпіяду. Хоць бы проста пабываць на п'едэстале Гульняў. Нібыта ў мяне ўсё для гэтага ёсць — класны трэнер, батут, але некаторыя важныя моманты я выпускаю — і тэхнічныя, і эмацыянальныя. Трэба падцягнуць псіхалогію, таму што пакуль я сам — галоўны вораг для сябе.

— Чым любіць займацца Іван Літвіновіч па-за межамі спорту, дзе яго можна сустрэць?

— У камандзе ёсць псіхолаг, не працуеце з ім над гэтай праблемай?

— Цяпер не, пакуль у мяне няма жадання.

— Пасля дзясятка гадоў трэніровак страх вышыні застаецца?

— Калі вучыш новы складаны элемент, адчуваеш нейкую невядомасць і ад гэтага баішся, але варта адзін раз паспрабаваць і страху ўжо няма — узнікае цікавасць.

— Раней любіў пасядзець у гаражы, калупацца ў машынах, матацыклах: мне здаецца, калі б не спорт, то менавіта з гэтым і звязаў бы сваё жыццё. Цяпер вольны час — гэта ўніверсітэт, кожны выхадны я там. Вучуся ў БДУФК на трэнера і часам думаю: лепш бы пайшоў у армію *(смяецца)*. Вельмі складана. Цяжэй за ўсё даецца анатомія, трэба вывучыць кожную костачку, кожную ямку.

Мінск—Стайкі—Мінск.

УВАГА ПРЫЗЁРАМ

Беларускую дэлегацыю з зімовых юнацкіх Алімпійскіх гульняў сустрэлі ў Мінску

У актыве каманды Беларусі на III зімовых юнацкіх Алімпійскіх гульнях дзве ўзнагароды: «золата» Ілы Корзуна ў хакеі і бронзавы медаль Юліі Кавалеўскай у біятлоне.

Дадому вярнулася першая частка дэлегацыі. У аэрапорце чэмпіёна Гульняў Ілью Корзуна і яго партнёраў па камандзе, гарналыжніка Максіма Давыдаўскага і трэнера Аляксандра Наканечнага, сустракалі прадстаўнікі Нацыянальнага алімпійскага камітэта, Міністэрства спорту і родныя.

Асаблівыя віншаванні з паспяховым выступленнем прымаў уладальнік залатога медаля Ілья Корзун, які ў хакеі 3х3 у складзе сваёй каманды перамог у фінале. «Кануты такой увагай да нашай каманды. Вядома, перад стартамі ў Лазане спадзяваліся на добрае выступленне. Калі ўжо ў ходзе спаборніцтваў выйшаў у фінал са сваёй камандай, то нацэліліся толькі на залаты медаль, — расказвае Ілья. — Рады, што дасягнуў гэтай мэты. Гэта добры вопыт узаемадзеяння разам з іншымі гульцамі, з якімі раней не сустракаліся. За кароткі перыяд нам удалося стварыць баяздольны калектыў і дамагчыся поспеху. Радуе і ўвага тут, у Мінску: прыехалі нас павіншаваць проста ў аэрапорт — прыемна бачыць такую ўвагу».

Трэнер беларускай хакейнай каманды Дзмітрый Мацюх адзначыў, што паспяховае выступленне гульцоў (акрамя залатога медаля Ілы Корзуна — чацвёртае месца ў Данііла Карповіча) сведчыць пра добрую школу падрыхтоўкі хакеістаў у Беларусі. «Галоўная мэта юнацкіх Алімпійскіх гульняў — не дасягненне нейкага канкрэтнага выніку, а зносіны паміж спартсменамі з розных краін. Гэта якраз прадугледжваў фармат спаборніцтваў па хакеі 3х3, дзе ў каманды ўваходзілі прадстаўнікі розных краін. Спадзяюся, хлопцы атрымалі задавальненне ад гульні, абмену вопытам і зносін, а мы пацвердзілі, што наша школа падрыхтоўкі дае вынікі», — адзначыў ён.

Напярэдадні падзеі

НА ПАРКЕЦЕ ДЗЯЎЧАТЫ З КЛЮШКАМІ

Чэмпіянат Еўропы па індорхакеі (хакей на траве ў закрытых памяшканнях) сярод жаночых камандаў пройдзе з 24 да 26 студзеня ў сталічным Палацы спорту

Турнір з'яўляецца другім па значнасці пасля Кубка свету. У спаборніцтвах возьмуць удзел восем наймацнейшых камандаў Еўропы: зборныя Беларусі, Германіі, Галандыі, Украіны, Чэхіі, Швейцарыі, Аўстрыі, Бельгіі.

Нагадаем, жаночая нацыянальная каманда Беларусі па індорхакеі з'яўляецца шматразовым прызёрам чэмпіянатаў Еўропы: у 2016 і ў 2018 гадах нашы дзяўчаты занялі 3-е месца. У 2018 годзе каманда стала бронзавым прызёрам Кубка свету.

Адзначым, чэмпіянат Еўропы стане адборачным да суветнага першынства 2021 года: 6 найлепшых камандаў атрымаюць права згуляць у гэтых спаборніцтвах.

Група А
Германія
Украіна
Чэхія
Бельгія

Група В
Галандыя
Беларусь
Швейцарыя
Аўстрыя

АРГКАМІТЭТ «ТОКІА-2020» ПРАДСТАВІЎ БІЛЕТЫ НА ЛЕТНІЯ АЛІМПІЙСКІЯ ГУЛЬНІ

У іх афармленні выкарыстаны традыцыйныя японскія колеры: чырвоны, сіні, пурпурны (колер японскай гліцыніі) і зялёны, якія па задуме арганізатараў адлюстроўваюць чатыры пары года.

У залежнасці ад месца правядзення спаборніцтваў адрозніваюцца колеравая маркіроўка і нанесеныя піктаграмы відаў спорту. Частка білетаў на маючыя адбыцца Алімпійскія гульні ўжо рэалізавана для мясцовых балельшчыкаў праз спецыяльную латарэю. Афіцыйны продаж стартуе вясной гэтага года.

Самыя танныя білеты каштуюць 22 долары. Самыя дарагія (на цырымоніі адкрыцця і закрыцця) можна набыць за 2680 і 1965 долараў. У сярэднім жа цана на іх устаноўлена на ўзроўні 72 долараў.

Нагадаем, XXXII летнія Алімпійскія гульні ў Токіа пройдуць з 24 ліпеня да 9 жніўня 2020 года.

Хакей. ЧС-2021

ЯНОТ, АЛЕНЬ І СУПЕРБУЛЬБА

Стартавала галасаванне за найлепшую ідэю талісмана чэмпіянату свету па хакеі 2021 года на думку балельшчыкаў

Кожны аматар спорту можа аддаць свой голас за ўпадабаны варыянт талісмана чэмпіянату свету, які пройдзе ў Мінску і Рызе з 7 да 23 мая 2021 года. Галасаванне пройдзе на афіцыйнай старонцы ФХБ «УКантакце» (www.vk.com/hockey_bel).

На конкурс ідэй талісмана было дасланa больш за 100 заявак ад прадстаўнікоў Беларусі і Латвіі, прычым свае работы прапаноўвалі як прафесійныя мастакі і студыі дызайну, так і звычайныя аматары хакея.

Увазе грамадскасці прадстаўлена 30 варыянтаў, якія ўвайшлі ў шорт-ліст конкурсу. Дарэчы, менавіта з іх ліку зорнае журы і вызначыць галоўны сімвал чэмпіянату. З беларускага боку ўдзел у выбары талісмана бяруць настаўнік мінскага «Дынама» Міхаіл Грабоўскі, чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка Дар'я Домрачава, рэзідэнт Comedy Club Андрэй Скараход, саліст гурта «Би-2» Шура-Бі-2, чэмпіён UFC Андрэй «Пітбуль» Арлоўскі, алімпійская чэмпіёнка па фрыстайле Ганна Гуськова, генеральны дырэктар «Беларусьфільма» Уладзімір Карачэўскі і старшыня ФХБ Генадзь Савілаў, з латвійскага — прэзідэнт федэрацыі хакея Латвіі Айгарс Калвіціс, тэлевядучыя Армандс Сімсанс і Айвіс Церынш, кіраўнік аргкамітэта турніру ў Латвіі Эдгарс Бунціс, гітарыст гурта Brainstorm Яніс «Magic» Юбалтс, спявак Інтарс Бусуліс і Каспарс Булс, выканаўчы дырэктар мабільнага аператара BITE Latvia.

Пераможца галасавання «УКантакце» атрымае падарункі ад аргкамітэта турніру і прыз глядацкіх сімпатый. Трэба адзначыць, што кожная з краін мае права вызначыць

свайго фаварыта — латвійскі бок таксама правядзе конкурс на званне найлепшага талісмана на думку грамадскасці.

Сярод прэтэндэнтаў на званне талісмана янот Гуляка, глушэц Дзібуртык (Бурштынчык або Крыштальчык), алень Чампі, Бусел і Пліска, вавёрка Яні, супербульба Лакі і іншыя. З поўным спісам і малюнкамі талісманаў можна азнаёміцца на афіцыйным сайце Беларускай федэрацыі хакея.

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

У тэму

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 10 «Аб падрыхтоўцы і правядзенні чэмпіянату свету па хакеі з шайбай». Дакумент распрацаваны з улікам вопыту правядзення II Еўрапейскіх гульняў і лёгкаатлетычнага матча Еўропа — ЗША, у ім прадугледжваецца комплекснае вырашэнне пытанняў падрыхтоўкі чэмпіянату свету па хакеі. Указам устанаўліваюцца бязвізавы рэжым для ўдзельнікаў, арганізатараў спаборніцтваў і замежных турыстаў, бясплатны праезд у грамадскім транспарце для акрэдытаваных асоб і вызваленне ад платы за праезд па платных аўтамабільных дарогах. Дакументам урэгуляваны пытанні медыцынскага абслугоўвання ўдзельнікаў і гасцей спаборніцтваў, выкарыстання дзяржаўнай маёмасці, размяшчэння сацыяльнай рэкламы. Акрамя таго, прадугледжана выдзяленне дырэкцыі чэмпіянату свету беспрацэнтнай зваротнай бюджэтнай пазыкі, а таксама меры, якія дазваляюць знізіць выдаткі і забяспечыць высокі ўзровень правядзення мерапрыемства.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 3 (491)

Фестывалім!

ЗАМЕСТ СНЕГУ — МУЗЫКА

«Студзеньскія музычныя вечары» ў Брэсце падаравалі нямала адкрыццяў

Аматары класічнай музыкі прывыклі, што год у Брэсце пачынаецца са славутых «Студзеньскіх вечароў». Гэты фестываль трывала асацыюецца з холадам на дварэ, калядамі святамі, асалодай вечнай музыкі. Помніцца, як на вакзале сустракалі оперных дзіў, якія выходзілі з вагона ў раскошных футрах... А цяпер можна і лёгенька апрануцца. Што ж, хоць зімы ў нас няма, а фестываль ёсць. Свята музыкі, на шчасце, ніхто не адмяняў.

Калі б на першым канцэрце-адкрыцці выступіў толькі выдатны ўкраінскі бас Тарас Штонда, варта было б гэты канцэрт праводзіць. Для яго непаўторнага голасу, здавалася, няма нічога немагчымага. Тарас — лаўрэат дзясяткаў міжнародных вакальных конкурсаў: ад іспанскага імя Віньяса і грэчаскага імя Марыі Калас да конкурсу імя Свірыдава і Собінаўскага музычнага фестывалю ў Расіі. Артыст дае сольныя канцэрты ў Данії, Нарвегіі, Швейцарыі, Чэхіі і іншых краінах свету. Ён выконвае рэпертуар вялікага Шаляпіна. Са сцэны Брэсцкага тэатра драмы прагучалі самыя розныя кампазіцыі: украінскія народныя песні, хіты сусветнага оперна мастацтва. Арыя князя Ігара з аднайменнай оперы Барадзіна сарвала сапраўдныя авацыі.

Падзеяй «Вечароў», несумненна, стала выступленне лаўрэата міжнародных конкурсаў, загадчыка кафедры спецыяльнага фартэпіяна Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Уладзіміра Дулава. Уладзімір Андрэевіч іграў у суправаджэнні камернага аркестра сваёй установы. І музыка была чароўная. Асабліва кранальным стаў момант прысвячэння: маэстра сыграў накцюрн фамінор Глінкі спецыяльна для Лілії Батыравай, арганізатара і нязменнага дырэктара фестывалю, які праходзіць у Брэсце вось ужо 32 гады.

Вялікія заслугі стваральніцы імпрэзы яшчэ раз падкрэсліў падчас адкрыцця фестывалю **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.** Мэр адзначыў таксама, што летась «Студзеньскімі вечарамі» мы адкрылі чараду святкаванняў тысячагоддзя горада, а цяпер працягваем добрую традыцыю, і паабяцаў спрыяць таму, каб «Вечары» жылі і развіваліся.

У другі вечар на сцэне іграў духавы аркестр германскага горада-пабраціма Брэста Равензбурга. Калектыў пад кіраўніцтвам Харальда Хепнера не першы год выступае на «Вечарах». Сёлета ён даў тры канцэрты: на сцэне фестывалю, у музычным каледжы імя Рыгора Шырмы і ў царкве хрысціян-адвентыстаў сёмага дня, дзе адбыўся бясплатны канцэрт для ўсіх ахвотных. Парадавала музычных гурманаў маладая, але тытулаваная расійская піяністка Дар'я Івонкіна, піяністка выканала найскладанейшы твор — «Успамін пра оперу «Дон Жуан». Дырэктар фестывалю Лілія Батырава знайшла яе ў Літве на міжнародным фестывалі «Музыка без меж». Лілія Рыгораўна была членам журы, а Дар'я на фестывалі заваявала Гран-пры. Тады ж і атрымала запрашэнне на «Вечары». Кітайская вакалістка Галіман Чжу таксама была заўважаная на адным з конкурсаў. Дзіўным па чысціні голасам яна выканала беларускую «Купалінку» і сарвала сапраўдныя авацыі. Раманс на кітайскай мове «Вечнае каханне» наша публіка таксама ўспрыняла ўзнёсла.

Упрыгажэннем музычнага форуму, несумненна, стала выступленне двух харавых калектываў. Кіеўскі маладзёжны камерны хор «Сафія» летась з трыумфам выступіў у Брэсце, таму калектыў і запрасілі зноў. Артысты ў фальклорных строях спявалі без інструментальнага суправаджэння. Яго ролю ў такіх выпадках выконваюць самі галасы вакалістаў. І гэтым разам хор парадаваў праграмай ад твораў найвышэйшага ўзроўню складанасці да ўкраінскіх народных песень. Асобна варта сказаць пра камерны хор Гомельскай абласной філармоніі пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Алены Сакаловай. За сваю саракагадовую гісторыю хор стаў пераможцам розных міжнародных конкурсаў і фестываляў. Пры яго выступленні не пакідала думка аб тым, што мы шукаем замежных зорак, а зоркі часта знаходзяцца побач, у сваёй краіне, нават у суседняй вобласці. Кампазітар і вакаліст калектыву Аляксандр Абросімаў здзіўляе джазавымі варыяцыямі вядомых песень. Прагучалі і велічныя калядныя спевы, і вядомыя рамансы, і народныя, і жартоўныя песні. Хор спяваў першае аддзяленне заключнага вечара, і публіка не хацела адпускаць гасцей; тым давялося адпрошвацца, бо спяшаліся на цягнік.

Сярод салістаў асабліва вызначыўся балгарскі тэнар Іво Іарданаў, саліст тэатра оперы і балета з Варны. Ён стаў сюрпрызам фэсту ва ўсіх сэнсах. Па-першае, таму што не быў заяўлены ў праграме і выступіў замест іншага артыста, які не прыехаў. А па-другое, спявак літаральна завёў усю залу сваёй яркай эмацыянальнасцю — яго «Містар Ікс», «Баядэра», іншыя нумары былі проста чароўныя.

Варта сказаць і пра трыа Канстанціна Віленскага, кампазітара і піяніста з Польшчы. Разам з брастаўчанамі Алегам Роўдам (ударныя інструменты) і Вячаславам Пляско (кантрабас) яны, несумненна, паказалі высокі клас музыкі. Трыа, дарэчы, іграла ў суправаджэнні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны Аляксандра Анісімава. Пра вядомы ў нашай краіне калектыў, які з трыумфам выступае ў розных краінах свету, наўрад ці скажаш нешта новае. Добра, што ён пасля пэўнага перапынку зноў ушанаваў «Вечары» сваім удзелам. Пад выступленне аркестра як не ўспомніць крылаты выраз Фрыдрыха Ніцшэ аб тым, што жыццё без музыкі было б памылкай...

Падчас цырымоніі закрыцця фестывалю **начальнік упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Сяргей ПАНАСЮК** зазначыў, што нам пашчасціла жыць у эпоху «Студзеньскіх музычных вечароў». «Студэнтам Брэсцкага музычнага каледжа я прысутнічаў на трох першых «Вечарах», слухаў Станіслава Рыхтэра. Пазней мы атрымлівалі асалоду ад спеваў Сяргея Захарава і Зураба Саткілавы, апладзіравалі Святаславу Бэлзу, а сёння маю гонар стаяць на сцэне побач з Аляксандрам Анісімавым», — сказаў Сяргей Панасюк. А нязменны арганізатар усіх «Вечароў» параіла на развітанне: «Прыходзьце на канцэрты і будзеце доўга жыць, бо класічная музыка падаўжае жыццё».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Падзея

АДБАЛЯВАЛІ

У тэатры оперы і балета прайшоў штогадовы Вялікі навагодні баль

Тут былі Скарлет О'Хара, Элізабет Бенет і Одры Хэпбёрн — баль у Вялікім тэатры оперы і балета, які традыцыйна праходзіць у ноч з 13 на 14 студзеня, адзінаццаты раз даў гасцям магчымасць адчуць сябе героямі раманаў і выгуляць свае выкшталцоныя ўборы, часта падрыхтаваныя адмыслова для падзеі. Пышныя сукенкі, шлейфы, рушы, пальчаткі і капелюшы ў жанчын, смокінгі, фракі і бабачкі ў мужчын — гэтым разам можна было разгледзець каля 650 (прыблізна столькі білетаў было набыта на баль) варыянтаў адпавядаючых дрэс-коду строяў. Мы зноў далучыліся да «вечарыны з прэтэнзіяй», каб паглядзець, як архаічныя фарматы ўпісваюцца ў сучаснасць, і можам сказаць: галоўнае, што тут варта рабіць, — танцаваць польку і контрданс.

З гэтых танцаў баль, што сёлета прайшоў пад тэмай «Кіно», і пачаўся. Білеты, як звычайна, апроч самой падзеі прадугледжвалі пад сабой наведванне рэпетыцый, якія для будучых гасцей стартавалі ў сценах Вялікага ў лістападзе. Уласна вяртаннем вальсаў і кацільёнаў такога роду падзеі і выключныя, бо іншым сучасным месцам, дзе бальныя танцы лагічныя, з'яўляецца хіба што харэаграфічная студыя, а гэта не лічыцца.

Танцавальныя часткі, а іх у праграме Вялікага балю было дзве — урачыстая ў якасці адкрыцця і адпаведны тэме Чаплін-баль, — суправаджаліся вуснымі падказкамі, калі паварот і з якой нагі пачынаць рух. Пары танцавалі ў фае бэльэтажа, фае балкона за імі назірала, а паралельна на ўсіх паверхах Вялікага тэатра віравала іншае жыццё.

Арганізатары робяць з мерапрыемства комплексную штучку: на бэльэтажы вальсы, у Камернай зале і на галоўнай сцэне музычныя канцэрты, а разам з гэтым караоке, конкурсы, прадказанні астролага, фотазоны і гульня ў «Мафію». У фае балкона і каля бараў расстаўлены сталы з ежай — пакуль адны танцуюць, другія ядуць бутэрброды і глядзяць у тэлефоны. Гэты папулярны фармат з распаўсюджанымі на святочных мерапрыемствах забавамі ў высакародным антуражы Вялікага паўтараецца з году ў год і дэманструе, як старадаўнія рэчы могуць падладжвацца пад сучаснасць. І часам, відаць, падладжваюцца так, што ты ідзеш на нешта выключнае ў выключным убранні — гэта ж бал, а трапляеш ледзь не на кірмаш.

Паколькі тэмай адзінаццатага балю стала кіно і праходзіў ён у ноч старога Новага года, рэжысёры прыдумалі для яго адмысловых персанажаў: ва ўрачыстым адкрыцці ўдзельнічалі эльфы, вялі яго Мантсэрат Кабалье і Лучана Паваротті, а ў якасці гасцей прайшліся Чарльз Чаплін, Ніколь Кідман, Мэрылін Манро, Ума Турман з Джонам Траволтам, Лайза Мінэлі і іншыя героі кінематографа (хоць у іх атачэнні з'явілася і рэальная персона — мастацкі кіраўнік Вялікага тэатра Валянцін Елізар'еў). У фае партэра гасцям прапаноўвалі «эпатажныя» выпрабаванні кшталту таго, каб спець песню пад рытмічны танец. У фае бэльэтажа было арганізавана «выязное казіно». У Камернай зале адбыўся майстар-клас па галівудскай элегантнасці. Адным словам, забаўляльнасць часам дамінавала над атмасферай высакароднасці, якую фармат балю прадугледжвае.

Але што сапраўды было варта ўвагі, дык гэта абыгрывание тэмы ў канцэртнай праграме, дзе ў выкананні музыкантаў і артыстаў Вялікага тэатра гучалі музыка і песні з фільмаў «Сняданак ля Ціфані», «Пан Тадэвуш», «Кабарэ», «Вестсайдская гісторыя», «Пасля тонкага чалавека», «Чараўнік краіны Оз», «Выпраўленаму верыць» і іншых, а таксама творы Чарлі Чапліна, што, як вядома, выступаў для сваіх карцін у тым ліку кампазітарам. Прыгожа, што госці балю і самі ішлі за тэмай: у жаночых строях можна было пазнаць матывы славутай сукенкі Одры Хэпбёрн у карціне «Мая цудоўная лэдзі» альбо Віўен Лі ў ролі Скарлет О'Хары.

Гледзячы на стракаты комплекс «паслуг», прапанаваны арганізатарамі свята, думаеш, што гэта ўсё камерцыя, маўляў, тэатр мусіць выкручваць з навагодняга балю ўсё што можа, каб прадаць як мага больш білетаў і падзарабіць грошай на касцюмы для новай оперы. Дзе там: імпрэза, аказваецца, не акупляецца. «Вялікі баль праходзіць у тэатры ўжо адзінаццаць гадоў і абсалютна не мае пад сабой камерцыйнай асновы, я сказаў бы, у яго, наадварот, больш дабрачынны характар і скіраванасць на духоўнасць, — кажа генеральны дырэктар тэатра Аляксандр Пятровіч. — Яго арганізацыя — вялікая справа, бо фармат балю дае магчымасць не толькі адпачыць і патанцаваць, але і адчуць унутры нейкую ўзвышанасць. Гэта не рэстаранна-танцавальнае мерапрыемства, а сапраўдны баль, я сказаў бы, з высокай літары з яго высакародным значэннем».

Падчас канцэрта-сюрпрыза, які праходзіў на галоўнай сцэне Вялікага, найлепшыя артысты тэатра атрымалі навагоднія тэатральныя прэміі ад галоўнага партнёра праекта Беларуска-швейцарскага банка «БСБ Банк». Яшчэ музыка з кіно, яшчэ бальныя танцы, яшчэ музычна-танцавальная праграма — і ў дзве гадзіны ночы Вялікі навагодні баль завяршыўся. Спадзяёмся, нехта страціў туфлік.

«У будучыні мы, напэўна, будзем мяняць фармат і большую ўвагу ўдзелім танцам, бо гэта яго аснова, і пастараемся зрабіць так, каб мерапрыемства прыносіла прыбытак, бо пакуль што выдаткі на яго арганізацыю і правядзенне значна вышэйшыя за даходную частку. Усё, што тут адбываецца, цудоўна і прыгожа, але тэатру трэба зрабіць гэта самаакупным альбо акупным на 99 працэнтаў, хоць ва ўсім свеце такое мерапрыемства — прыбытковая справа», — падсумоўвае Аляксандр Пятровіч.

Налета Вялікі навагодні баль, дванаццаты, па традыцыі адбудзецца ў ноч з 13 на 14 студзеня. Калі гэта будзе сапраўдны баль, без кірмашовай мішуры, ён напэўна, акупіцца.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Асоба

Глеб ОТЧЫК:

«З ПРАПАНОВАМІ ПРЫХОДЗІЦЬ ТОЛЬКІ ПЯЦЬ ПРАЦЭНТАЎ МАСТАКОЎ, А АСТАТНІЯ ДЗЕВЯНОСТА ПЯЦЬ КАЖУЦЬ «ДАЙ»

Ужо месяц Саюз мастакоў, у які ўваходзіць больш за тысячу сяброў, дзейнічае пад кіраўніцтвам новага старшыні: 17 снежня на з'ездзе Саюза на змену Рыгору Сітніцу быў абраны 36-гадовы Глеб Отчык. Паколькі ўваходзіць у курс справы ў спадара Глеба — мастака, выкладчыка і да гэтага першага намесніка старшыні суполкі асаблівай патрэбы не было, мы прыйшлі ў офіс аб'яднання і ледзь не з парога задалі пытанне: якая праблема стаіць для Саюза найбольш востра?

— Я ведаю гэтую кухню даўно, і для мяне самым актуальным пытаннем з'яўляецца ўласна магчымасць працаваць і ўмовы працы мастака, то-бок цэны на арэнду майстэрняў, заказы на скульптурныя ці манументальныя творы з боку дзяржавы, супрацоўніцтва з камерцыйнымі галерэямі і гэтак далей. Усё тое, што спрыяе развіццю аўтараў і ўвогуле культурнага асяроддзя, а адначасова — прапагандзе высокага мастацтва і павышэнню прэстыжу краіны за мяжой. Да пастаяннага павелічэння цэн мы ўжо неяк прызвычаіліся, больш актуальнай з'яўляецца сацыяльная абароненасць мастакоў, якія могуць аддаць мастацтву жыццё, прычым з удзелам у буйных рэспубліканскіх і міжнародных праектах, адстойваючы годнасць беларускага мастацтва ў кантэксце сусветнага, а пенсію атрымаць, быццам адседзелі дармаедамі. Нашу краіну ведаюць у тым ліку дзякуючы мастацтву, і для мяне важная магчымасць пераглядаць канкрэтныя выпадкі, калі ўнёсак у беларускую культуру даказаны.

— Тыя ж майстэрні ўжо даўно гучаць у якасці праблемы — у чым тут справа?

— У мастацкім асяроддзі вялікі перакос: нехта прадае свае творы за тысячу рублёў, а нехта за пяць і больш. Апошніх не вельмі шмат — з тысячы толькі сто мастакоў добра зарабляюць і без праблем аплачваюць майстэрні. А ёсць тыя, каму ў прапанаваных умовах не пашанцавала, альбо яны пакуль не знайшлі свайго гледача, альбо не валодаюць камерцыйнай жылкай, таму маюць асаблівую патрэбу ў пастаяннай магчымасці зарабіць. Напрыклад, аналагічнае аб'яднанне мастакоў у Швецыі падтрымлівае ўсіх сваіх сяброў, нягледзячы ні на што, і для ўсіх стварае аднолькавыя ўмовы, не выступаючы ў якасці суддзі, які ацэньвае, хто і чаго варты. Мы таксама з дапамогай дзяржавы маглі б даць мастакам дадатковыя магчымасці зарабіць.

— Неўзабаве пасля таго, як вы сталі старшынёй Саюза, прагрымела трагедыя з Захарам Кудзіным. Калі сталі разбірацца з прычынамі самагубства, гаварылі і пра тое, у якіх умовах мастакам часам даводзіцца існаваць і як ацэньваецца іх праца. Як, на ваш погляд, мастак адчувае сябе ў нашым сённяшнім культурным кантэксце?

— Калі нехта думае, што мастаку лёгка дзесьці ў іншай краіне, а я ведаю шмат калег з Чэхіі, Галандыі, Даніі, — то не. Я і сам пасля заканчэння Акадэміі пачынаў з дэкаратыўнага тынкавання сцен, а зробленыя грошы ўкладаў у сваё развіццё. Некалькі гадоў я правёў на будоўлі, перад тым, як нарэшце атрымаць замовы на роспісы і фрэскі. Калі ў мяне не было магчымасці зарабляць мастацтвам, я не пераставаў пісаць — палова дня з тынкоўкай, астатні час з жывапісам. На апошнім курсе Акадэміі я наняўся ў «Керамін», дзе распрацоўваў калекцыі плітак. Мастак павінен прайсці гэты шлях як іспыт, толькі нехта праходзіць яго за два гады, а нехта — за дваццаць: пачаць з таго, што ты геній і краіна павінна табе ўсё даць, не можа ніхто. Таму часам даводзіцца наступаць сабе на горла, але я б не сказаў, што ўмовы для развіцця ў нас горшыя, чым за мяжой. Каб мастаку ў Германіі выставіцца ў прыватнай галерэі, можа спатрэбіцца заплаціць пятнаццаць тысяч еўра, а тут, вядома ж, ніхто такіх грошай не папросіць.

— Але ж ёсць нейкія аб'ектыўныя характарыстыкі сферы — у нас сціплы арт-рынак, не распаўсюджана калекцыяніраванне, не хапае прыватных галерэй.

— Арт-рынку ў нас проста няма, бо ім ніхто не займаецца, адпаведна тыя нешматлікія калекцыянеры, што валодаюць тысячай і больш твораў, не могуць ацаніць свае калекцыі. Пакуль у краіне карціна не стане таварам, арт-рынак не ўзнікне. Нашы сябры — Белгазпрамбанк — праз «Восеньскія салоны» і іншыя імпрэзы спрабуюць яго фарміраваць, але пакуль гэта толькі першыя крокі. Вы не заўважыце ў нас актыўнай куратарскай работы, а па вялікім рахунку, каб не было трагічных здарэнняў, калі з Акадэміі мастацтваў выпускаецца таленавіты мастак і не ведае, куды прыткнуцца, павінен быць нехта, хто яго падхопіць. Думаю, Саюз і Міністэрства культуры таксама маюць удзельнічаць у гэтых працэсах, нам трэба праводзіць семінары, канферэнцыі, сустрэчы і разам разважаць аб тым, чаго сферы не хапае і як палепшыць сітуацыю, а не маўчаць да першай бяды. Тым не менш, мне здаецца, змены ў беларускім мастацтве за апошнія гады відавочныя, у тым ліку адносіны дзяржавы становяцца больш уважлівыя.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Што, на ваш погляд, трэба зрабіць, каб стварыць у Беларусі арт-рынак, і ці шмат тут залежыць ад дзяржавы?

— Ад дзяржавы залежыць, канешне, шмат: з яе боку можна павялічыць артыкул на мастацтва ў бюджэце краіны і, напрыклад, вярнуць савецкую практыку, калі ў будаўніцтве адзін-два працэнты ад агульнага бюджэту аддаваліся на мастацкае аздабленне — тады б у нас з'явіліся манументальныя, рэльефныя, жывапісныя творы і скульптурныя кампазіцыі. А ў цэлым пачынаць трэба з адукацыі. Я нарадзіўся ў Гомелі і па адной з чарнобыльскіх праграм два месяцы вучыўся ў Галандыі. Я пасябраваў з сям'ёй, у якой жыў, і мы таксама запрасілі яе ў госці. У іх было пяць хлопчыкаў ад пяці да пятнаццаці гадоў, і на выстаўцы ў гомельскай галерэі я запытаўся, якія работы ім падабаюцца найбольш. Мой бацька тады быў старшынёй Гомельскага абласнога аддзялення Саюза мастакоў, і ён быў уражаны тым, як яны разбіраюцца ў мастацтве. Аказалася, яны з маленства хадзілі на выстаўкі, а з такой практыкай за некалькі гадоў, хочаш ці не, у цябе сфарміруецца густ і ты будзеш сам аналізаваць і купляць мастацтва. Таму яшчэ адна неабходная для з'яўлення мастацкага рынку рэч — уключэнне рэгулярнага наведвання экспазіцый, абавязкова з мастацтвазнаўцамі, у адукацыйную праграму. Я ўжо не кажу, што чым больш у нас будзе аўкцыёнаў, выставак і міжнародных кантактаў, тым хутчэй рынак будзе фарміравацца.

— Возьмем умоўнае палатно Глеба Отчыка за пяць тысяч рублёў: яго лёгка прадаць у Беларусі?

— Не. Пакуль што не. Кошт, які ў мяне больш-менш склаўся, — дзве тысячы рублёў, я працую ў гэтым дыяпазоне. Цану на творы, якія мне шкада прадаваць, я павялічваю. Яшчэ ёсць любімчыкі, якія ўвогуле не прадаюцца. У мяне ёсць адзін сакрэт: калі пішаш карціну з «заточкай» на продаж, яе ніхто не купіць, а тое, што шчыра напісана для сябе, абавязкова купіцца, не сёння, дык заўтра.

— Вы неяк выказвалі думку, што каб атрымаць водгук ад публікі, мастацтва павінна «бударажыць». Як яго такім ствараць і дзе тут пралягае мяжа паміж дазволеным і недазволеным?

— Трэба асучасніваць падачу і канцэпцыю мастацкіх праектаў. Мне цікава рабіць тэматычныя выстаўкі кшталту «Apple смак», якую некалькі гадоў таму мы прымеркавалі да Яблычнага Спасу і для якой прапанавалі мастакам, у тым ліку эстонцам, літоўцам, ірландцам, абыграць тэму яблыка. У нас выдатна выступіў гурт Apple Tea, мы разлівалі кальвадас, і толькі на адкрыццё, хоць яно было летам, прыйшло пяцьсот чалавек, а ўвогуле экспазіцыю ўбачыла пяць тысяч. На тэму сямейнага гвалту мы рабілі выстаўку «Мяжа», якая атрымалася, па водгуках гасцей, не горшая за біенале. Каб мастацтва было цікавае публіцы, яно павінна быць сучаснае. Цяпер я працую над ідэяй выстаўкі «Увайсці ў IT» — мы ж пазіцыянуем сябе як IT-краіну, — што адкажа на пытанне, як сучасныя тэхналогіі паўплывалі на жыццё і мастацтва. Мяркуецца, што аўтары абсалютна розных кірункаў падрыхтуюць эскізныя праекты, камісія зробіць адбор і найлепшыя атрымаюць гранты на шасцімесячную работу. Памятаю, для выстаўкі ў гонар пяцісотгоддзя кнігадрукавання нам прапаноўвалі пейзажы і нацюрморты — так жа нельга, таму гэтым разам мы жадаем атрымаць адмыслова падрыхтаваныя тэматычныя работы. Мне самому цікава, як тэму IT раскрые народны мастак, а як — студэнт Акадэміі.

— А калі выказаць думку, што беларускае мастацтва не атрымлівае дастатковай увагі, бо не адпавядае парадку дня, вы пагодзіцеся?

— Я шмат вандрую і магу сказаць, што беларускае мастацтва прафесійнае і разнастайнае. Мы не страцілі школу, і нашы творцы каціруюцца за мяжой. Проста яны пакуль што боўтаюцца самі па сабе — хто на сёрфінгу, хто на лодачцы, хто на надзіманым матрацы, нехта проста грабе, нехта ў шапачцы, нехта без, а трэба пасадзіць іх у адну лодку і прапанаваць падняць ветразі. За тры гады ў нас прайшло 443 выстаўкі, не лічачы міжнародных пленэраў і прыватных акцый: думаю, такую справаздачу ў Беларусі ніхто не дае. Мы чуем скаргі на тое, што ў Палацы мастацтва прадаюцца мёд, шкарпэткі і майткі, дык давайце ператворым гэта ў адмысловую акцыю — прапануем мастакам папрацаваць з мёдам альбо размалюем майткі і прадставім аўтарскую бялізну, то-бок хай гэта будзе падзея. Трэба нешта ініцыяваць, але пакуль што з прапановамі прыходзіць толькі пяць працэнтаў мастакоў, а астатнія дзевяноста пяць — я не ведаю, адкуль у нас гэта пайшло — кажуць: «Дай». Я нават хацеў Саюз перайменаваць у «Дай».

— Вы кажаце, што канцэпцыяй можна прыцягнуць увагу да мастацтва. Як думаеце, ці прыцягнуў публіку ў сферу мастацтва перформанс Аляксея Кузьміча ў ЦСМ?

— Безумоўна, бо пра гэта шмат гаварылі, мне нават знаёмыя з вёсак на гэты конт телефанавалі. На мой погляд, мастацкія акцыі і павінны мець нейкі працяг, а не абмяжоўвацца самімі сабой, але калі загнаны ў кут мастак спрабуе да некага дастукацца акцыянізмам, гэта ў любым выпадку крайнасць, якая сведчыць пра існаванне пэўнай праблемы. Я прапаную спрабаваць дастукацца разам, для таго грамадскае аб'яднанне і існуе, як калектыўны розум. Я вітаю ідэі, разлічаныя на карысць для ўсяго Саюза, напрыклад, праекты, за якія мы атрымліваем зніжкі на майстэрні альбо прадаём дзяржаве творы. Трэба быць рэалістам, а не нацягваць зорку на лоб у надзеі на Млечны шлях.

— Акцыя Аляксея Кузьміча была скіравана супраць цэнзуры з боку Міністэрства культуры. Ці сутыкаецеся вы з цэнзурай?

— Пры Саюзе мастакоў працуе выставачны камітэт, дзе калегі розных кірункаў — графікі, жывапісу, манументальнага мастацтва і так далей — ацэньваюць у першую чаргу прафесійныя вартасці твораў, а потым іх адпаведнасць аўтарытэту арганізацыі, то-бок нормам нашага Статута і Кодэкса аб культуры. У царкве не будзеш хрысціць трохкутнікам, а ніякіх дадатковых забарон у нас няма. Падчас падрыхтоўкі выстаўкі «Мяжа» мне як куратару давялося адстойваць перад калегам работу Міхаіла Гуліна, у цэнтры якой знаходзілася нецэнзурнае слова. Твор мы ў выніку пакінулі, прыйшло Міністэрства і ніхто нават з яго прадстаўнікоў не ўбачыў нічога крамольнага. Мастацтва само па сабе бязмежнае, можа, нехта сам малюе цэнзуру, але ад яе трэба ў любым выпадку пазбаўляцца.

— Адной з задач Саюза, як я разумею, з'яўляецца наладжванне міжнародных прафесійных стасункаў, а наколькі на сённяшні момант беларускія мастакі ўпісаныя ў міжнародную тусоўку?

— Творы нашых аўтараў захоўваюцца і ў прыватных замежных калекцыях, і ў сур'ёзных музеях. Глянеш на іх біяграфіі — а яны поўныя згадак пра вядучыя пляцоўкі. Я шмат бываў за мяжой: там ведаюць Зою Літвінаву, Леаніда Хобатава, Васіля Касцючэнку, Леаніда Шчамялёва, у Італіі часта называюць Міхаіла Савіцкага. Я сам да пасады ў Саюзе мастакоў паўдзельнічаў у больш чым сарака міжнародных пленэрах і магу сказаць, што беларусаў запрашаюць з задавальненнем: мы заўсёды адказна і з высокім прафесіяналізмам падыходзім да работы і падтрымліваем нацыянальную рэпутацыю. Васіль Шаранговіч расказваў, як ён рабіў дыпломную работу ў графіцы, а гэта было больш за пяцьдзясят гадоў таму: ён працаваў паўтара года, начаваў у майстэрні і здаў пятнаццаць аркушаў. Гэтыя творы і цяпер выглядаюць сучаснымі, гэта не толькі тытанічная, самаахвярная праца, але і высокапрафесійная. Калі працаваць, гэта заўважаць, магу вас запэўніць: на нашы выстаўкі ў Мінску ходзяць эксперты са Швецыі, Нарвегіі, калекцыянеры з іншых еўрапейскіх краін. Усё бачаць. Ніхто незаўважаным не застанецца.

Гутарыла
Вольга МІЦКЕВІЧ.

Извещение о проведении аукционных торгов по продаже имущества, обращенного в доход государства по Брестской области

№ лота	Наименование объекта / характеристика объекта	Местонахождение объекта / кадастровый номер участка	Начальная цена продажи, руб. До проведения уценки	После проведения уценки на 10 %	После проведения уценки на 20 %	После проведения уценки на 30 %	После проведения уценки на 40 %	После проведения уценки на 50 %	После проведения уценки на 60 %	Сумма задатка, руб.
1*	Капитальное строение с инвентарным № 123/С-8700 (**Одноэтажный, деревянный жилой дом**) площадью 57,4 кв. м, жилая площадь 19,1 кв. м, 1946 года постройки. (Составные части и принадлежности: *Одноэтажный, деревянный жилой дом, веранда, четыре сарая, колодец*)	124386502601000028 Кобринский р-н, Тевельский с/с, д. Девятки, ул. Первомайская, д. 46	1779,93	**1601,94**	**1423,95**	**1245,96**	**1067,97**	**889,98**	**711,99**	70,00
